**Славамір Адамовіч**

# Плавільшчыкі расы

выбраныя вершы

Вільня-Мінск
1999

*Адамовіч С.*

*Плавільшчыкі расы: Выбраныя вершы. “Наша Ніва” (Бібліятэка “Вострая Брама”, 4). 1999.*

«Плавільшчыкі расы» – шосты паэтычны зборнік Славаміра Адамовіча. Першая, яшчэ савецкая кніжка называлася «Кальварыйскія клёны». Гэта 1990-ы. Час, калі прадукцыя самвыдавецтваў пачынала патроху легалізавацца і са зьместу не заўсёды можна было адрозьніць цэнзураваную кнігу ад нелегальнай. Наступныя – «Зямля Ханаан» і «Зваротныя правакацыі» выйшлі адпаведна ў 93-м і 94-м у Полацку, пазначыўшы тагачасны рэнэсанс беларускіх рэгіёнаў. Кніжка «Каханьне пад акупацыяй» друкавалася ў 96-м у Польшчы. А чытаў аўтар гэты зборнік ужо ў турме. «Сьпіраль Бруна», якая ўключыла турэмныя вершы, друкавалася зноў у Менску, у 98-м. І вось нарэшце «Плавільшчыкі расы» – кніга, якая выходзіць у Вільні, аб’ядноўвае ўсё лепшае з папярэдніх, быццам зьбірае сьляды паэта, раскіданыя ў часе і прасторы.

# З кнігі «Кальварыйскія клёны»
*1990*

## ДОЛЯ

Ня кідай мяне, добрая птушка,
забяры ў вышыню за сабой.
Я вузенькай чырвонай істужкай
праплыву па-над белай зямлёй.

Зачаплюся на ймгненьне за вежы
разбатрачанай даўніны,
кіну цень на асеньнія межы,
на пушчанскія лахманы.

Хай крычаць мне: ні пуху, ні пер’я!
К д’яблу загадзя ўсё пашлю.
У душу беларускі веру я,
з крывічанкай вазьму шлюб.

Перад тым, як зь зямлёй навечныя, –
прысуседжуся зь небам, зорамі...
Ой ты доля мая перапечная,
перавітая ўкрыж аборамі!

## ЯДЛОЎЦАВАМУ КУСТУ

У ігліцы тваёй захаваўся ўздых чысьціні.
Мне здаецца, апошні.
                    Так жаласна каня крычыдь.
Нехта ў матчынай хаце на захад вакно расчыніў,
каб у промнях крывавых
                    палёт кажаноў прасачыць.

Чуеш стогны? То крушні ўлягаюцца спаць.
Вунь кеменьні наверсе варушацца, як шчанюкі.
І на вейцы ў зьвярыны
                    аб літасьці сьлёзы трымцяць.
І ад вільгаці мякнуць баразнаў груды-камлюкі.

Ты расьцеш на зямлі, да якой прырастаю і я.
Ты аўтар мой зялёны, прыстанак лятункаў і мар.
А яшчэ, можа, дуб сярод купін ды звон ручая,
і забыты ратаем, зарослы травою папар.

* * *

Глянцавіты зялёны брусьнічнік,
упаду я ў твой дробненькі цьвет,
і, як той закаханы язычнік,
напішу свой паганскі санэт.

З гіяцынту, падбелу, рамонкаў
шматкалёрны атрамант зраблю
і пісаць буду сьмела і звонка
пра ўсё тое, што ў сьвеце люблю.

А люблю я адчайна і дзёрзка
пекнату залатых нагаткоў,
і маю рудавокую цёзку,
і шурпатасьці першых радкоў.

А люблю я грымотаў раздольле,
чысты лівень, а, зрэшты, і пыл,
калі пыл гэты з роднага поля,
па якім мой бадзяўся капыл.

Я ня ведаю, што па-за сьветам,
і ня ведаю, што па-за мной,
чую толькі, як сэрца каметай
працінае развагаў канвой.

І за гэта люблю маё сэрца,
і шкада мне раба ў сьлязах,
што іграе пужлівае скерца
на зламаных маною басах.

*Багацькаўка! Мая мілая і ўмесьце з тым пастылая Багацькаўка! Люблю я цябе з тваім садком, ляском... Люблю тваіх мілых, слаўных, вяселых дзетак, тужлівых старычкоў і вясёлых пявуньняў-дзевак. Ненавіджу тваю гразь, непрытульнасць. Скарэй набрацца сілухны і пачаць варушыць камні...*

Максім Гарэцкі

Тамсама ўсё квітнее вішня й бэз,
а гордыя асьверы крэсьляць неба,
там богавым аблокам не пасьпець

ад воч людзкіх схаваць запрэжку Фэба.

Тамсама ўсё шархучая трава,
і шэры чмель, і пыл, і скрып атосы,
і ровар, нахілёны да слупа,
і я бягу, расхрыстаны і босы.

О вобразы крывіцкія! О сьвет
і любасьць над усім без атачэньня!
Як хутка ападае белы цьвет,
і як марудна сьпее плод праменны.

## РАЗМОВА ЗЬ ЯШЧАРКАЙ НА ПРЫДАРОЖНАЙ КРУШНІ

Сястра мая, шэрая яшчарка,
ня бойся маёй далані,
я брат тваіх вымерлых прашчураў,
а больш я ня маю радні.

Я неба ня прагну высокага,
сястра, я люблю спачываць
на ўскраіне поля шырокага
і песьню пра волю сьпяваць.

Люблю я згадаць пра мінуўшчыну:
жытнёвыя мэндлікі ў рад,
гліняны спарыш з хлебнай гушчаю,
і пожня, і сьлёзы, як град,

пажары, грымоты і печышчы,
і побач з ральлёю – дзірван,
і сымбаль крывіцкае вечнасьці –
амшэлы жвіровы курган.

І памяці гэткай, о шэрая,
ніколі ня збыцца мне, не!
Жыву я зь вялікаю верaю
на круглым маім валуне.

* * *

Калі сьціскае грудзі боль сьмяртэльны
і трызьніцца асочнікаў гайня,
так хочацца з разгушканых арэляў
у зорны сьвет, які б мяне прыняў.

Сярод планет ляцеў бы я і падаў,
губляючы пякельны боль з грудзей,
а ўпаўшы на Юпітэравы грады,
я збудаваў бы новы Калізэй.

Я пасадзіў бы там дубы і сосны,
бязь ліку руж, півоняў і вяргінь,
я пчол бы там разьвёў ды дзікіх восваў,
я даў бы жыць усім – і сам бы жыў
сярод багоў цнатлівых і багінь.

* * *

Калі сьціскае грудзі боль сьмяртэльны
і трызьніцца асочнікаў гайня,
так хочацца з разгушканых арэляў
у зорны сьвет, які б мяне прыняў.

Сярод планет ляцеў бы я і падаў,
губляючы пякельны боль з грудзей,
а ўпаўшы на Юпітэравы грады,
я збудаваў бы новы Калізэй.

Я пасадзіў бы там дубы і сосны,
бязь ліку руж, півоняў і вяргінь,
я пчол бы там разьвёў ды дзікіх восваў,
я даў бы жыць усім – і сам бы жыў
сярод багоў цнатлівых і багінь.

* * *

Я не прыйшоў, калі яго хавалі
гарачым днём у гліну і падзол,
калі пасьля за чаркай спаміналі.
а бабы дружна хліпалі ў падол.

Яшчэ ў дварышчы моцна пахла стружкай
і перагарам ад паяльных лямп,
а ўжо хадзілі, нос задраўшы, служкі
і пасьмяротны пелі дыфірамб.

Ды што яму да гэтай позьняй славы,
яму, хто пеў жывую трату дзён,
хто засядаў на непадсуднай лаве
і быў заўжды, як вечны маладзён.

Сьпяшае час. Пчала зьбірае ўнёсак.
Вільготны крыж – яе аэрадром.
Даўно паэт ня ставідь лішніх косак,
бо лёс паставіў кропку за радком.

* * *

Кальварыйскія клёны асеньнія скінулі ўборы.
Квадратура вакон пачарнела на тварах дамоў.
Завастрыліся скулы завулкаў, і чорныя шторы
захінулі ад сьвету людзкія і радасьць, і кроў.

У клааку ракі бруднапёрыя падаюць птушкі,
і бягуць неахвотна па мёртвай паверхні кругі.
Лістападаўскі вецер хістае рудыя пялюшкі,
на бязьлюдных бульварах
скуголячы жудка з нуды.

На брутальных прыпынках
плакатнасьць у рваных афішах.
Пад нагамі прахожых
канчаецца сёньняшні дзень.
Мы на белых палотнах нанова гісторыю пішам,
наступаючы сьмела на ўласны спалоханы цень.

## ЗАЎТРА

Заўтра зноў уставаць
і кудысьці сьпяшацца,
і пра нешта казаць,
і пра штосьці спрачацца.

Заўтра зноў да людзей,

зноў глядзець ім у вочы,
каб якісь «дабрадзей»
мне пра лёс мой прарочыў.

Заўтра зноў да сьвятла
прадзірацца скрозь цемру,
пакуль нехта са зла
не працэдзіць: «Знай меру!»

Заўтра зноў у чарзе
забіваць сваё месца,
каб пачуць, як вярзе
алкаголік пра вечнасьць.

Заўтра зноў да станка,
а пасьля за канспэкты,
ад цямна да цямна,
толькі ноч на пражэкты.

Ноччу воля твая –
мар аб шчасьці і славе.
І прысьніцца ральля,
белы конь на атаве.

І прысьніцца яшчэ
стан дзявочы ў абнове,
і бацькоўскі прышчэп,
і матуліна мова.

## БАТАНІЧНАЯ ВОСЕНЬ

Яшчэ на рагу гандляркі
марозіва прадаюць
і смажаць тлустыя скваркі
ды воцат на іх ільюць.

І нечы стомлены тата,
ахвяруючы выхадным,
у кампаніі жонкі і брата
шашлычны нюхае дым.

Ізноў аднавілі піва:
пі цяпер, хоць заліся!
Паветра ранішняга разьліву

з прымаразкам на лісьцях.

Купіць хіба што квіточак,
зайсьці за браму ў сад.
І нават ня ў сад – у садочак,
ды выкашляць вуліц чад.

І доўга сядзець на лаўцы,
усьміхаючыся прыгожым
у небе аблокам-свацыцям,
што плывуць да сьвятой Каложы.

## ВЕРАСЕНЬ

Жанчынай надкушаны яблык,
з асеньняга саду лісток,
пад вішняй самотныя граблі
і сьмецьцем забіты рышток.
І ў гліне сьляды басаногай,
і дождж, цалавальнік сьлядоў.
І вочы каровы бязрогай,
і бездань пражытых гадоў.

Ды толькі мне зь вечнай самотай
шкада не дзіцячай пары,
а гэных лістоў з пазалотай
на ціхім крывіцкім двары.

Глянь: там, дзе прастор верасьнёўскі,
і тут, дзе зьбянтэжаны я,
дымяцца кастроў пахітоскі
і пахне марозам ральля.

* * *

Павісла пража маткі боскай
паміж ядлоўцам і асінай,
бяз шуму лішняга і лоску
спраўляе восень атрасіны.

Стаяць у роздуме стагодзьдзяў
руіны замкаў зваяваных,
дух страты лётае ў прыродзе,

над пляцам скібы неаранай.

Чыесьці крокі ўздоўж ля прорвы
і цягне ўбок і дзесьці ўніз.
З карункавых фантасмагорый
малюе вецер Ex Libris.

* * *

Паперадзе бязлюднай электрычкі
Кульгавы змрок ляціць у нікуды,
І падаюць спалоханыя знічкі
Ў рачныя ціхаплынныя брады.

Схаваліся ад непагадзі душы
Пад абарог, адзін на цэлы свет.
А свет злажыў хатуль і сцежкай рушыў,
Смакуючы сяголетні ранет.

Ягоны шлях кіруе у суквецце
Галактык чыстых, дзе няма хлусні
1 дзе на кожнай роснае планеце
Травой жывуць шакалы і ласі.

* * *

Кармінавая цішыня,
крывіцкая прастадушнасьць,
ды хочацца на рысях
сыты спакой парушыць.

Дагератыпы дзён
мне абрыдлі нарэшце.
Гэй, хто там да волі жадзён?
Душу са мною пацешце.

На геаграфічнай карце
мы знойдзем зялёны востраў.
Пляваць мы хацелі на «рацыё»
дзеля пачуцьцяў простых.

Ёсьць сонца, неба і хлеб з вадой,
і, дзякуй Богу, Радзіма.

Імкнуць магутнаю плынь-ракой
праз Бацькаўшчыну гальфстрымы.

* * *

Не сьпяшай, мая рыжая векша,
на чужое плячо не сьпяшай.
Гэта ж я напаткаў цябе першы,
гэта ж мой ты прагнала адчай.

Будзе шэрае веча гарланіць,
меднагорлыя будуць крычаць:
разлучыць і свабоды пазбавіць!
Хай на столь у вязьніцы глядзяць.

Толькі ты, мая рыжая векша,
не пужайся людзкой дурнаты.
Сьціхне веча, насупіцца вечар,
і засьвеціцца серп залаты.

Рог затрубіць, гукне акарына,
хваля вольнасьці грудзі спаўе.
Першы твой і апошні мужчына
прад табой на калені ўпадзе.

*Рахиль! Для того, кто во власти твоей,*
*Семь лет – сдовно семь ослепительных дней.*
Ганна Ахматава

Перуны адгрымелі. Прасохлі вясёлак палітры.
Загудзелі нясьмела чмялі ў бліскавічнай траве.
Аблачынаў на небе чытаю рухомыя цітры
і хапаю ў далоні дажджамі абмыты прамень.

Чую дух анархізму ў пыле, прыбітым на сьцежцы,
па якой я бягу да цябе, рудавокі матыль.
І шчасьліваму сэрцу ў грудзях немагчыма і цесна,
бо чакаеш, блакітная, ў садзе зялёным, Рахіль!

Там і тут раскідалася сонца па кветках падбелу,
зыркіх промняў адбіткі я бачу ў паглядзе тваім.
О случанка-душа, пакладзі маё сэрца на белым!
У цнатлівых прасьцінах
мы разам ад шчасьця згарым.

* * *

Вы чыталі Міцкевіча; ціха трымцелі між пальцаў
з дробным шрыфтам старонкі;
стаяла сьляза у вачах.
Нехта ўнізе, далёка, імкліва прабег па асфальце.
Нехта крыкнуў у цемру:
«Бадзяюцца тут па начах».

Нехта бразнуў дзьвярыма –
панеслася рэха дварамі
і, расьпятае, сьціхла на сініх ваконных крыжах.
І ўзмахнулі Вы раптам, як белае ўночы, рукамі,
схамянуліся, нібы ад ветру званочкі ў лугах.

О мая крывічанка, мая дарагая, пяшчота
ахінае душу маю ў гэткі трывожлівы час.
Хай жа крые на сьвеце
на гэтым Вас Бог ад самоты,
калі ўсё ж такі нельга шчасьліва злучыць яму нас.

* * *

Як закаханы ўпершыню хлапчук,
які рукой дрыготкаю кранае
дзяўчыны неспакойную руку,
так я падношу пацеркі твае
да губ маіх. І чую водар цела
твайго. І страшна мне і сьмела.
Гляджу ў каралі воч тваіх я сёньня.
Знадворку хтосьці піша нам на шкле:
Яна + Ён.
І заўтрашні нам сьветлы дзень відзён.

**ГУЛЬЛІВА**

Ласкавы аксаміт гардзін
і Вы, жаданая, ў фатэлі.
Гадзіньнік, нібы муэдзін,
і томік «Выбранага» Шэлі.

Мы тут. Мы лобач: я і Вы.

Крыштальны келіх. Дно пустуе.
За мной ня прыйдзе паставы,
таму я сёньня ў Вас начую.

Дванаццаць ночы. Ціхі час.
Крыштальны келіх зноў парожні.
Калі нараньні знойдуць нас,
хай зброя застанецца ў ножнах.

**ПРЫЗНАНЬНЕ**

На белай прасьціне ружаў вячэрніх
чырвоны сполах застыў.
Мой шосты месяц, высокі чэрвень
мяне прад Вамі скарыў.

Між пальцаў Вашых душа бадзягі
сьлізнула жоўтым рамонкам на дол
і там памерла, як даўні шлягер.
Яе аплакаў залётны анёл.

* * *

Чэрствым акрайцам у кіпені пачуцьцяў
разбракаю, каб, як зь цеста, новага сябе
вылепіць і паставіць на патрэбнае месца,
зерне пакінуўшы на новы засеў.

* * *

Калі запросяць мяне ў краіну,
дзе продкі нашыя княжаць наўзьдзіў,
ты ня кідай на каўчэг мой гліну,
а гронку воўчага лыка ўскладзі.

Дай мне ружовую замест сьвечкі,
каля галавы пакладзі, як вянец.
Ціхманыя воблакі, нібы авечкі,
няхай абжалосяць мой хуткі канец.

# З кнігі «Зямля Ханаан»
*1993*

* * *

У рыдване каціцца прывідам
з красавіка ў лістапад
і за пяшчанай дзікай відмаю
апошні раз зірнуць назад,

і на шляху, дзе ліст асінавы
гніе зь бярозавым лістом,
згубіць сьлязу пад крык: «гэй, сівыя!»
ды моцна вытнуць пугаўём;

і пакідаць адзаду бездараж,
і дрэнь падзей, і думак бруд,
з адной душою нержавеючай
перабіраць з груда на груд.

Між траваў, там, сярод шматколерных,
дзе высах скрыпень-фараон,
хай ля бярозавай расколіны
мяне засьпее дзіўны сон.

* * *

Маіх вачэй расчыненыя форткі
глядзяць у сьвет, дзе восень і дажджы,
дзе лістапад у жоўтыя абгорткі
паапранаў шурпатыя глыжы,

дзе не знарок, а больш па завядзенцы
узад-уперад ходзіць паміж дрэў
зьбялелы промень восеньскага сонца,
які душы, на жаль, мне не сагрэў;

і дзе няма ўжо буйства белых красак,
а толькі сум півоняў ды жарства,
на хутары пустым шаленства масак
і непатрэбства думак пра дзяржстрах.

І ўсё ж люблю лістоты жоўты прысак,
бурштынавыя вочы сонных зьмей,

таемнасьць соваў і адкрытасьць плісак,
ну і, вядома, крышачку – людзей

* * *

На ўзроўні маланкі ды грому
я трымацца сабе загадаў,
бо ня мог я ніяк па-другому,
бо заўсёды я волі жадаў.

Я забраў з сабой кветку альвасу,
рой пчаліны й сям'ю мурашоў,
два гладышыкі сьвежага квасу,
страказу і знаёмых вужоў.

Каб у небе ня стала мне сумна
зь перуном і маланкай утрох,
прыхапіў я і хутар, і гумны,
васількі і жыты на палёх.

Я пакінуў, да волі ахвочы,
марны клопат людзкое чаргі,
каб мяне на мяжы дня і ночы
прывіталі Айчыны багі.

* * *

Як я люблю, зямля, тваю аздобу,
што прарастае ў травах і лясах,
дубоў малых упартую худобу,
пад бокам шышку ў сініх верасах,

на курганах і купінах брушніцы,
багульніку суседзтва і чмялёў,
ружовы скрыпень, жамяру кастрыцы,
асенні дым і вечны сум палёў.

Люблю шукаць гармонію ў лістоце
асіны дрогкай, у калючках ёлкі,
сасны крывой, што вырасла ў балоце,
люблю кустоў зялёныя суполкі...

Бо, як сказаў паэт, навошта колас,

калі ня ў модзе сіні васілёк?
Я за цябе, зямля, ўздымаю голас,
і для цябе я свой цягну вазок.

## ЗЯМЛЯ ХАНААН

Дзе блакітны ядловец свае збудаваў піраміды,
дзе стаяць векавечныя дрэвы у зялёных імхах,
дзе люблю я жанчыну ў вобразе юнай сільфіды,
там сьвятая зямля, там стагодзьдзямі ўвесь я прапах:
там жыве патаемнае ў пушчы цватлівай, а ўраньні
там на сонцы раса зіхаціць, як сухое ў фужэрах віно,
там чмялі прызнаюцца чмяліхам у верным каханьні,
там бабры запрашаюць на сьвяты ў сваё казіно;
на дзядзінцах штодня, высьпяваючы, грэюцца кветкі,
срэбра крушняў дажджы намываюць, а ліпеньскі гром
там лагонка грыміць, і рамонкі – нібыта сурвэткі
ў сталавальні, дзе госьці сабой ажыўляюць мой дом;
у прыполе начніц дагараюць там ясачкі-зоркі,
а самотны пугач, тэрарыст глухадольных балот,
штосьці «па фені» балбоча й ляціць яго крык за пагоркі,
дзе філоніць сава, дзе кажан зачапіўся за дрот...
О зямля Ханаан! Я прыдумаў цябе не для ўцехі,
а хутчэй для таго, каб душу ўратаваць ад бяды,
каб любіць твае храмы й палацаў бліскучыя стрэхі,
і дуброваў тваіх залатыя, дальбог, жалуды.
І пакуль на стале маім горы папер і асадак,
а на чыстым лісьце я пішу свой чарговы радок,
ты ня зьнікнеш, зямля, і ня зьнікне твой вечны парадак,
і наступнай вясной твае дрэвы распырскаюць сок.

## ХЛАРАФІЛАВЫ БУНТ

Гэтым днём сьмецяры не пазналі
растапыраных вуліц клындайк:
скрозь асфальт палыны прараслі,
дзьмухаўцы заклікалі на страйк,
штурмавала макрыца будынкі,
засланялі каштаны прастор,
буйных траў аксамітныя фінкі
праглі ўткнуцца ў чэрава зор,
пыл рамонкавы слаўся франтальна,
сьмецяры адступалі ў двары,

узрывала чаромха татальна
гарызонты барвовай зары.
Сонца! Сонца зь нябёсаў сьвяціла,
жыцьцядайныя промні шлючы,
каб зялёная дзёрзкая сіла
залівала худыя хвашчы.
На шыньёны квітнеючых ліпаў
прызямляліся пчолы сям’ёй,
а з карэктнага воблака сыпаў
ціхі дождж на квяцісты налой.
Паўставалі пялесткаў цунамі,
віравалі на кветках чмялі,
і ва ўлоньнях бутонаў сьлязамі
H20 праступала з ральлі.

**ШОРАХІ**

Ледзь толькі пагасьне сьвятло ў пакоі,
ледзь толькі пасьпее агмень азалець –
зьяўляюцца шорахі шыхтам, як воі,
і ўраз па кутох пачынаюць шумець.

Нахабна ў шуфляды залазяць. Да раньня
на почапках віснуць уніз галавой.
Здаецца, нібыта я чую дыханьне
іх душаў нікчэмных у цемры начной.

Мне золка, як зьверу ў лядашчай бярлозе,
мне шорахі-шпегі жыцьця не даюць.
Сваім шаргаценьнем па шорсткай падлозе
яны мае тайны на сьвет дастаюць.

Іх цэры а-за жоўтых шпалераў сьмяюцца,
ў старой шыткаўніцы яны грамадой
міжсобку шальмуюць мяне і злуюцца,
што ўпарта хачу я знайсьці супакой.

На кніжных паліцах, дзе столькі паснула
раманных паяцаў, багоў, прыгажунь, –
там шорахі шорхнуць з часоў Вэльзэвула,
там месяц глядзіць на іх зь неба, як лунь.

І я ў гэтай кодле ня йму паратунку,
бо толькі пад раньне сьціхае мой боль,

калі, пакідаючы брудныя шлункі,
зьнікаюць начніцы скрозь белую столь.

## ЭКСПРЭСІЯ (andante, presto)

Шукай мяне, рэха,
ня там, дзе лацьвей,
дзе мне не да сьмеху,
дзе ў полі разьвей.
І там, дзе прыстойна,
дарма не шукай,
і там, дзе застойна,
і там, дзе шугай[1].
Шукай мяне ўпарта
ня там, дзе няма,
дзе пільная варта
і замак-турма,
дзе ў лесе памерлым
ні гуку, хоць плач,
дзе выцьвілі пэрлы
і жоўты касач...
О, рэха! Аднойчы
спаткаемся мы
далей ад калючых
дратоў і турмы,
далей ад памерлых
лясоў і балот,
ад выцьвілых пэрлаў
і крыкаў «народ!»,
далей ад вар'ятаў,
сьляпых і глухіх,
ад здрады і кратаў,
і словаў благіх.
Аднойчы ў блакіце
раскутых нябёс,
аднойчы ды ў жыце,
у холадзе рос,
у тле папялішчаў,
у цьвілі кладоў,
у цемры гарышчаў
бяэьлюдных дамоў...

---

[1] Шугай – вецер (аўт.)

О рэха! Аднойчы
спаткаемся мы.
Вось будзе пацеха,
вось будуць грамы!..

## ФАЙНА

Файна, што столькі фуфаек сьцягаўшы,
змог я нарэшце купіць гарнітур,
чорны капелюш і вузенькі гальштук,
скрып чаравічны ды плашч і каптур.
Файна, што ўрэшце сабе я дазволіў
сьнеданьне ўраньні, нармальны абед,
зрэдчас – вячэру, і крыху сваволі,
радасьці жменьку і жменьку манет.
Файна, што восень, што мілыя твары
пачасту бачу ў пакоі маім,
файна, што здуру ня трапіў на нары,
файна, што грэе мне ногі кілім.
Файна, што нарачанскія сосны
помняцца мне ў мітусьні гарадоў,
файна, як файна, о Божа мілосны,
мець і надзейных, і мужных сяброў.
Файна, калі дастаткова ў каханьні
цёплага позірку, еднасьці душ,
сьмеху крывіцкай дзяўчыначкі Фані,
файна, калі апантанасьцю дуж.
Файна а трэцяй гадзіне уночы,
верш напісаўшы, прылегчы й заснуць,
сон сабе высьніць пад раньне прарочы...
Файна, калі твае песьні пяюць!

## ПАВОДЛЕ ФРЭЙДА

У пакоі маім альвасы
не цьвітуць, але гэта не
азначае, што я тым часам
не аматар кветак. У сьне
мне зьнўляюцца краскі лета
залацістых паўвыспаў. Там
гэтаксама, як тут, гарсэтна,
і хапае працы рукам.
Там шыпшыняцца плошчы. Пушчы

каранямі ўрасьлі ў базальт,
а ў каньёнах, зарослых плюшчам,
рязьліваецца нейчы альт.
Сьніцца мне пра сады, дзе ружы,
дзе язьмін і блакітны бэз;
сьніцца, што, малады і дужы,
з маладою я п'ю шартрэз;
сьняцца сны-паралелаграмы,
кубаэльфадратызмы дзён;
сьняцца травы, адсутнасьць хамаў;
сьніцца дзедаў ляжак-услон;
сьняцца моры, лясы, бязьлюдзьдзе,
толькі я ў зеляніне гор;
сьніцца ўсё, што было й што будзе;
сьніцца мне: я ляту да зор.

* * *

Мой бог даўно мяне пакікуў,
адрокся д'ябал назаўжды,
і валасоў маіх мякіну
ня мыюць жоўтыя дажджы.

І сябра, славаю абраны,
плюгавым стаў і зьнік з вачэй,
і я нічый цяпер падданы,
і мне цяпер крыху лягчэй.

Назад вярнуўшыся ў цянёты
імхоў, ядлоўцу і расы,
я п'ю з чмяліных тонкіх сотаў
за грэх жаночае красы.

## ВЕРШ ДЛЯ ЮЛІІ

Вось і ты, маладая, молада
пакідаеш мяне на прэч,
наталіўшыся ўзахап з голаду
спрытам рук маіх, сілай плеч.

Пакідаеш, а я, нявыпіты,
буду днець, як пушчанскі зьвер,
і са мной мой дзяржаўны скіпэтар,

і пажадлівы дух папер.

Пакідаеш, а мне ня бачыць бы
ўсіх астатніх, адно каб ты,
і каб разам і неабачліва,
геніяльна і без лухты.

Пакідаеш... Ты вельмі юная,
ты на іншай глебе расьцеш,
і таму наша міні-вунія
разьвітальны стварыла верш.

Ах, турчанка мая баўгарская!
Ах, дачка Тахтамыша, – кроч!
Мне шкада, што карона царская
да тваіх не пасуе воч.

* * *

Разгубіліся вусны мае прад спакоем тваім, шэравокая. Усе здрады й глупствы мае – прабачаеш. Усяго мяне разумееш і да рук сваіх прымаеш такога, як ёсьць. У вачах тваіх бачу золак Бацькаўшчыны. Дай жа сілы, паляшучка мая, сілы, каб голаў узьняць і ў дарозе Дзень Самапазнаньня сустрэць. Дабраслаў, чыстая! Дабраслаў, гадаванка абшараў палескіх! Трывогу тваю да сваёй даяднаю, каб золак той у Дзень разгарэўся ясны. Шляхам пайду.

Азірнуся – вочы твае.

* * *

Я вечна адзін. Прыходзьце
глядзець мой старэнькі «тэле».
Мы будзем удвох на самоде.
Намітусь у мяккіх фатэлях.
І вы мне раскажаце нешта
пра тое, што іншым да фені,
што ў краме скруцілі вам рэшту,
што ў вашай маленькай жмені
ня маеце вы нічога,
што хочацца вам проста,
як іншай любой жанчыне,
мужчыну любога росту

(хай нават не разумее,
каб толькі быў зрэдку побач).
Я вечна адзін. І на фі –
ласофій кнігі-тамы!
Заходзьде без эпітафій,
мы будзем з вамі «на ты»,
а з намі будзе, дальбог жа,
хтось трэці, як быццам звыш,
нашэптваючы прыгожа
пра Хельсінкі і Парыж.

## СОНЦА

ўзыдзе і зойдзе, а я цалавацьму цябе, о жанчына! І расьцякацца па белым тваім буду плоймай новых жаданьняў, а ты? О маўклівая цярплівіца, як сама зямля Беларуская, ты аддасі мне моц тваю, паляшучка. О ваўчыца мая! Ты народзіш мне дужых ваўчанят, і яны разьбягуцца па нашых пушчах, яны ачысьцяць ад сьмерду нашу зямлю й народзяць нашчадкаў з густой поўсьцю, моцнымі ікламі і разумнымі вачыма. О жанчына-паляшучка-ваўчыца! Ты выведзеш аблуднае племя на вольны пляц, ты пакажаш лянівым і галодным золата пад іхнымі нагамі-лапамі. Ты й маё вызваленьне. Чуеш? Пушча шуміць-шэпча – кліча нас. Там, у дрэваломе, на йгліцы пад магутнай сасной я прашапчу табе твае любімыя словы, мая ваўчыца-паляшучка-жанчына: у гэтым жыцьці

ты –
мая
зорка,
паходня,

## СОНЦА

* * *

Ну чаму вы так позна зьявіліся
і цяпер побач з вамі не я
у паставе і рухах Азірыса?
Ну чаму побач з вамі не я?

Вы ўжо нешта ў жыцьці гэтым зьведалі,
ды ня ўсё, бачу я, я ледзь-ледзь.
Прад чужым закрываеце пледамі
вашых ног нечапаную медзь.

Бачу я, што зь вялікаю любасьцю
вы цалуеце ў вусны яго,
пакідаючы мне з маёй грубасьцю
для спажытку тутэйшы арго.

Што ж, бывайце! Я заўтра, здарожаны,
не зайду ў ваш дзявочы пакой.
Конь мой быстры даўно растрывожаны
і дрыжыць пад знаёмай рукой.

І чакае мяне поле вольнае,
і ядлоўцу шыхты, і дзірван,
і асадка, і муза крамольная,
і сьвятая зямля Ханаан.

* * *

Сайку белага хлеба
ем з табой сухама,
ты дзяўчына што трэба,
ты ўсё робіш сама.
Колькі марыў я, люба,
пра такую, як ты;
колькі лаяўся груба,
нарабіўшы лухты;
колькі выхадзіў шляхам,
дзе адна гавыла,
дзе распалася прахам
не адна галава.
Ах, дзяўчыначка-ліха!
Ах, дзяўчына-краса!
Ты любі мяне ціха,
як зямельку раса,
Ты любі асьцярожна,
асьцярожна жартуй,
на травіцы мурожнай
ты мяне намалюй.

* * *

Ах, як прыгожа твае рукі
нам сьцеляць першы раз пасьцель.

Паклалі ціха свае лукі
амуры-зводнікі на кмель.

Кілім смарагдавы хавае
ступні тваіх маленькіх ног,
нібыта ў мяккім малачаі,
альбо ў драсёне ля дарог.

Твая сукеначка ў фатэлі,
твой станік, пацеркі, што так
блішчаць прывабліва. І келіх,
а ў ім віна знаёмы смак.

Пад лёгкай коўдраю таемна
застылі сьвежыя прасьціны
і мы з табою узаемна,
і пад вакном кусты язьміну.

Таршэр стары і галавасты
расьсеяў хітраваты бляск,
мацьней акрэсьліўшы пілястры
і ў нашай згодзе прагу ласк.

## ЖАНЧЫНЕ, ШТО ПАКІДАЕ МЯНЕ

Душы маёй поўныя соты
зьнішчайце пурпурам губ
і піце прагка, да рвоты,
з другімі ўступаючы ў шлюб.

Вазьміце мяне і зьешце,
як пепін ці бутэрброд,
і сплюньце рэшткі нарэшце
са сьмехам проста за плот.

А хочаце я, пасьцельны,
увесь, як таматны сок,
прыйду да вас на пахмельле
ў раёне eleven o'clock.

І вы, захліпнуўшыся мною,
і я, вашых думак сьмех, –
закусім сыпкай халвою
ня дадзены іншым грэх.

## РАЗМОВА ЗЬ СЯБРАМ

Мяне хапае на кароткі верш,
на лёгкі флірт з прыемнаю жанчынай,
а што я зьдзейсьніў у жыцьці найперш –
ня ведаю, як, зрэшты, і прычыны.

І ўвогуле – я дбаю пра сябе,
сябе люблю, ў сабе люблю капацца,
сябе выносіць на сваім гарбе,
кяб потым жа сабе і падабацца.

І часта мне даводзіцца ірваць
на целе ўтаймавальную кашулю,
бо хочацца кахаць, каб не скаваць,
жыцьцё зьмяніўшы на пятлю ці кулю.

Пра кулю я, аднак, усё ж зманіў,
бо зброя ў нас даўно не прадаецца,
і піва не заўсёды на разьліў,
ды і на вынас хутка зноў зьвядзецца.

Так і жывём. А што да маіх вершаў,
дык гэта ад таго, што ні рубля,
што продак мой жыцьцё сваё завершыў,
ніколі не хадзіўшы ў сабалях.

Вось так, браток, а словам ты ня вер,
бо прыгажосьць адна і варта ўвагі.
Дарэчы, дай дзясятку напавер:
я ўжо даўно заходжуся ад смагі.

## Introductio

Зноў чарговая восень, дажджы,
грукаценьне трамвая,
кантралёры з жэтонамі ловяць «зайцоў» за
каўнер,
хтосьці ў бруднай кавярні прыткнуўся
за столікам з краю,
не пазбаўлены, зрэшты, прыстойнасьці
сьвецкіх манер.
Традыцыйна каштаны губляюць грубую
лістоту,

правінцыйны вятрыска туляецца ў вулках
старых,
і нязбыўную носяць прахожыя ў душах
самоту,
а ў дварышчах барыгі капейкі трасуць на
траіх.
Чыста голены муж уцякае ад жонкі ў
кантору,
дзе чакае яго сакратарка, пяро і фатэль,
дзе ад сьвету схаваецца ён за казённую
штору
і ў кябыт адплыве, нібы прывідных мар
карабель.
Зноў чарговая восень; бач, хтосьці
на добрым падпітку
затрымаўся ля тумбы афішнай, шукае
расклад цягнікоў;
хтосьці выгляд зрабіў, што яму аніколькі ня
брыдка;
хтосьці сплюнуў пад ногі; прайшла грамада
дзецюкоў.
А на горад вось-вось зноў няпэўнасьць
дажджамі пральецца,
і жывое наўкол халадэча пратне да касьцей.
У завулку Рабкораўскім ціхі вар'ят
засьмяецца,
бо адзіны ён знацьме сцэнарый далейшых
падзей.

## ВІТАМІННЫЯ ХЛОПЧЫКІ

**Тым, хто застаецца са мною**

Вітамінныя хлопчыкі дбаюць пра ўласнае
цела,
мінэральную п'юць і ня паляць зусім
цыгарэт.
Ім яшчэ па-сапраўднаму ў гэтым жыцьці
не балела,
ім яшчэ не карцела аднойчы пайсьці
ў іншасьвет.
І таму яны сёньня тусуюцца ў белай
альтанцы,
дзе патроху пляткараць увогуле і ні аб чым,
прагназуючы прышласьць, тасуючы

ўласныя
шанцы,
і блефуючы роспачна-доўга пад небам
начным.
Хай жывуць вітамінныя хлопчыкі мірна і
ціха,
так жывуць, каб ня ведаць пра божы і
д'яблаў
прысуд,
ну, а мы, стырнавыя, мы будзем змагацца,
як дыхаць.
Нам аддзячаць пасьля апалёгіяй нашых пакут.

## СЯБРАМ «ТАЛАКІ» 1985 ГОДУ

Добра быць філёлягам, паэтам, прамоўцам,
спэцыялістам у сфэры тэм і рэм,
вымаючы і сьпелячы слоўца за слоўцам
з моўнага плянктону, з акіяну лексэм.

Але так хочанца мне, катораму
ніводная з вышэйпералічавых «пасад»
не даспадобы, як лекі хвораму, –
як хочацца дажыць мне да Новых Каляд!

І тады няхай штукары-арыфмэтыкі
пужаюць чалавецтва бясконцай лічбай –
я буду кахаць, дарыць жянчыне кветкі,
птахам лётаць і плаваць рыбай.

Калі ж валачобнікі прыйдуць на Вялікдзень,
адзычу хлапцам апошні кус
і сам пайду, але не як прыхадзень,
а ўцяміўшы да скону, што я – Беларус.

## У КАВЯРНІ

Калі прыходзяць фраеры ў кавярню,
а я адзін за столікам, і пуста
у філіжанцы з абламанай ручкай,
мне сумна, злосна мне, сьвятло вялікай
люстры
тяксама раздражняе, за стойкаю бармэн

агідна тлусты;
а я,
хацеў бы я тады душы знаёмай
сваю душу хоць крышку прыадкрыць,
хацеў бы паказаць, як пакрыёму
блакітным пальмцом яна гарыць;
гарыць, але чаму
і для каго,
і дзеля
чаго гарыць?

Аднак жа
вяртаюся ў кавярню, дзе пуста,
дзе фраеры, шархочучы «капустай»,
бяруць маўкліва на душу па сто.
Адзін сяджу, а сільфы ды анёлы
пакінулі мяне сам-насам з чымсьці,
чаму я не магу знайсьці найменьня,
і не магу я ўстаць, каб ціха выйсьці,
і ўсё хутчэй ідзе працэс гарэньня.

* * *

Стамілася, ледзьве што дыхае цела,
і штосьці рыпяць пазванкі і суставы.
Вось клапан усхліпнуў і сэрца замлела
ўсяго на трынаццатым кубачку кавы.

Пусты, як патэльня, пакой, дзе шпалеры
у цемры блішчаць фасфарычным сьвятлом,
дзе сумныя ложкі, шалёныя дзьверы,
дзе ўсё, што ні знойдзеш, ёсьць мэталалом.

Згарэў калярыфэр. За шыбаю – мінус.
Пад коўдрай казённай таксама ня ў кайф.
Заснуць бы, забыцца хоць пастай «калінас»,
і з Богам праклясьці паршывае «лайф».

І ўсё ж я шапчу сабе: «Нельга, зямеля.
Вось трошку пацерпіш, а там – на прастор.
Там зноў будзе воля, сяброўкі ў фатэлях,
і ты сярод іх, нібы той Чарнамор.

Зноў будуць размовы, напой, цыгарэты,

і будзе спакойна, і будзеш ты жыць...»
Ды сёньня хачу я з адчаем камэты
у трыццаць няпоўных усё завяршыць!

* * *

Я ніколі ня лашчыў радкі свае,
я іх біў па скулах і рэбрах,
каб яны рассыпаліся іскрамі
і былі камусьці патрэбны.

І пакуль мне сьпявалі начальнікі
пра імкненьне да еднасьці душ,
я прадсэрдзяў крывавыя сальнікі
прамяняў на пялёстачкі руж.

І было мне тады фіялетава,
што там скажуць вучоныя лбы
пра мяне і капелюш мой фэтравы,
і пра цяжкія продкаў хлябы.

Я пішу на ружовых пялёстачках
і на цэтліках з крамы «Тытунь»,
каб мае неразьвітыя костачкі
закапалі пад шчыльную рунь.

# З кнігі «Зваротныя правакацыі»

*1994*

## МЫ

Дождж прайшоў. Сонца. Трава расьце. Блішчаць валуны. І мы расьцём, дужэем, наліваемся моцай і гартуем наш дух.

Мы высока. Абапершыся на плячо маланкі і на поўныя грудзі ўдыхаючы азон, мы гаворым з самім Перуном. Мы памятаем сказанае: «Мы – дамо! Мы – сіла! Мы – права!» Бо мы маем нашу зямлю. Зь яе мы паўсталі, яе любім, у ейнае ўлоньне мы вернемся. І ў гэтым вечным кругабегу нам наканавана зьдзяйсьняць волю ёю народжаных – нашу волю да жыцьця.

Мы – здаровыя. Прыгожыя. Маладыя.

Мы на маршы. Шырэй крок! Раз-два, раз-два... Насустрач сонцу, дажджу, ветру. Па нашых дарогах. Мінаючы старыя дзядзінцы, гарадзішчы, замкі. На Ўсход. На Захад. На Поўдзень. На Поўнач.

Гэй, хто там супраць?!
Зьняць засьцерагальнікі.
Агонь!

* * *

Тутэйшыя мальвы і ластаўкі
жывуць па-тутэйшаму тут,
і траваў расістыя каслаўкі,
і мокры кастрычніцкі груд.

Жыву тут і я па-тутэйшаму,
бязьдзетна і ціха, як ёсьць,
шукаю гадамі пякнейшага,
пакуль не прайшла маладосьць.

Канцоўкі пішу да пачатага,
пачатае рву на шматкі,
а дзесьці за плугам аратага
кладуцца барознаў радкі.

## АЛЬТРУІСТЫЧНАЕ

Калі мне пачалі даваць,
я ўжо быў сыты,
але не адмаўляў, хаця
быў як спавіты
ці то сном летаргічным, ці
сусьветнай комай.
Я быў як вецер у трысьці,
засьпеты стомай.
Мне не хацелася, каб так,
што дазарэзу.
Я ціха тлеў, я траціў смак,
і нават рэзус мяняла кроў мая ўва мне
спакойна, ўпарта.
І мне было, як на вайне
ці ў кнігах Сартра –
нудотна, брыдка, а рабі.
І я стараўся
араць глыбока плоць ральлі,
цягаў каменьні на грудзі крушняў,
а калі яны прасілі: досыць! досыць! –
я заціхаў і слухаў шэпт
гарачых вуснаў.
Удзячны шэпт.

## СОН ПРА НОЖ

Любімы сябра, зроблены аднойчы
з бліскучай нержавейкі, на заказ –
лязо тваё цалую, ойча, тройчы,
гарачым языком кранаю паз –
рышток, старанна выразаны майстрам
з адною мэтай: каб сьцякала вон
кроў чорная з варожых чорных сэрцаў,
каб вораг наш знаходзіў хуткі скон.

* * *

Я ў даланю бяру халодны тронак,
нібы ўзыходжу на айчынны трон...
Каліны сок сьцякае долу з гронак,
і разам зь ім пра нож зьнікае сон.

* * *

Блукаю і блудадзею
са словам – яно маё.
Яно мне дорыць надзею,
яно мне жонкаю ё.

Са словам іду я ўпрочкі
на месяц, на год, на два.
І мала мне цёмвай ночкі,
і што ж мне, што $CO_2$.

Са словам я аўтаномны:
бадзяюся і буджу
заспаных зьвяроў і гномаў,
дыктатара і раджу.

Ах, слова! Адзіны сябра,
з табой у зьвязцы іду
скрозь логвы чырвоных фабрык,
скрозь мёртвую рэк ваду.

Мы дойдаем з табой – да славы
альбо да згубы – няхай!
Ты – слова маё, я - Слава,
А з намі і ў нас – наш Край.

* * *

Пекнасьць простае рэчы,
слова, музыкі, формы,
жар нацепленай печы
і гармонію нормы,

і твае, дзеўчынёшка,
худаватыя плечы,
і прыгожую ножку,
і маўчаньне дарэчы,
профіль сумны і хваляй
валасы, німбы нібы, –
гэта ўсё я і слаўлю,
напінаючы фібры.

## МОМАНТ ПЕРАМЕНЫ РЫТМУ

Вы зайшлі на некалькі хвілін,
пахам сну бязгучна атулілі,
ціха запыталі, чый я сын,
і за штосьці нават пахвалілі.
Я маўчаў, я крэмзаў на лістах
словы, непадобныя на словы.
На старой рабіне шэры птах
лопаў крыльлем. Зырка сьпелі дровы
ў белай грубцы – іх сьпяліў агонь.
Выло нам сьвята. Потым
вы белы шалік скінулі на капу,
прайшлі ў пакой, пасьля прыселі,
белаю рукой аперліся на брыж.
Ложак рыпнуў. І тады зьляцелі
вам пад ногі дзьве пушынкі звыш.
Гэтак пад стары пахілы крыж
восеньню зьлятае лісьце з клёнаў
на вясковых могілках, дзе сьпяць
нашы продкі, век свой перабыўшы
па чужых законах...
Вось і ўсё. Дасьпелі дровы ў печы.
Кахля разагрэла пахі сну.
Я падумаў: Божа, як дарэчы,
што ня трэба заўтра на вайну.

* * *

Калі жанчына спажывае грушу,
ці яблык, ці кавалак мяса сьпелы,
дасмажаны на новенькай патэльні, –
люблю я назіраць і ў гэтым бачыць
вялікі сэнс, і прыгажосьць, і радасьць.
Няхай жа зьмест арганікі бялковай
падтрымлівае пекнату кабеты,
каб здольная была яна заўсёды
мяне завабіць не кавалкам мяса,
дасмажаным на новенькай патэльні,
а пульхнасьцю сваіх ружовых вуснаў,
і ямкамі на гэтых самых шчочках,
і таліяй, таўстою ці ня вельмі,
але каб мог абняць я беспраблемна,
каб мог абняць яе пасьля вячэры,

і, сытую, каб мог сабой насыціць,
а потым-потым выслухаць падзяку
і задушыцца ў белым прасьціradle
ад радасьці, што меў яе такую.

*23 верасьня1993 году.*
*Электрычка «Менск – Баранавічы».*

* * *

Зіма. Разгуляўся люты.
Правінцыю замяло.
Над чорным будынкам гуты
зьвілося дымоў кубло.
Направа, дзе дом бяз вокан,
а пятай сонца зайшло.
У чорнай пасьцелі кокан
зарыў чалавек хайло.
Няхай не бянтэжыць слова
апошняе вас, ханжа.
Я ведаю: гэта клёва,
нібыта ясі з нажа.
І потым, шматфарбнасьць фразы
ня сьведчыць пра ейны зьмест.
Бываюць такія фазы,
калі вырашае жэст.
Бывае, што трэба рэзка,
дарэшты ісьці на разрыў,
пакуль не згарыць, як трэска,
твой  самы сьвяты парыў.
Зіма, я люблю твой холад,
мароз твой, рэдкі цяпер...
На жаль, я зусім ня волат,
на шчасьце, яшчэ ня зьвер.

* * *

Трапіўшы ў белую гурбу грудзей,
я астываю ад жарсьці,
адпачываю ад брудных людзей
і небясьпекі старасьці.

* * *

Зіма – ні марозу, ні гурбаў,

ні сьнежнае бабы ў двары.
Чамусьці ў душы нейк груба,
і хочацца ўпасьці згары.

І не даляцець, а згубіцца
у сінім ядлоўцавым сьне,
у рыжа-блакітнай іглiцы,
у гуках старога Маснэ.

## ТАЦЦЯНЕ

Пра ўсіх ня думай дрэнна,
мяркуючы па мне.
Мажліва, я – антэна,
мажліва, што і не;
мажліва, я лакатар,
мажліва, толькі шлюз,
мажліва, экскаватар, –
капаю дрэнь і друз,
што людзі накідалі
за тысячы гадоў;
мажліва, я – сандалі
стаптаныя багоў;
я сьлікагель, мажліва,
і моры сьлёз людзкіх
высмоктваю чульліва
з кватэраў гарадзкіх;
мажліва, я і прагну
рабіць дабро, але
хутчэй за ўсё я – магма,
і стыну на скале;
мажліва, я кахаю,
але ня так, як вы;
мажліва, я хаваю
пад пахай нож крывы,
і вы не рызыкуйце
са мной ісьці ў кіно –
я блытаю часамі
жывую кроў зь віном!

## РАНІШНІЯ КАНТАМІНАЦЫІ ЗЬ ПЕРАЎВАСАБЛЕНЬНЕМ НА ФОНЕ СОНЦА І ДАЖДЖУ

Калі, зубоў прарваўшы белую ахову,
язык мой схопіць кроплю ранішняй расы
зь пялёсткаў толькі што расквітлай ружы –
о! гэта будзе момант пранізьлівае радасьці,
калі клінок шурпаты языка
ўвап’ецца ў сэрца самае бутона.
О, космас! Неўнікнёнасьці тваёй
я прагну, я – той чмель,
якому трэба многа, многа кветак,
зь якіх бы ён мог браць пылок,
яго ператвараючы ў мёд вечнасьці.
Вось я, але хто ты,
чыя так сьмела раніцай расістай
сьпее кветка? І для чаго,
раскошная надзіва,
і ўвечары, і ўраньні спакушае
аблокі, набрынялыя дажджом?
А можа, так і трэба?
І хай ад жарсьці пекліцца душа.
Няхай яна, застаўшыся у зрэбным,
у рызманах і босая, адна,
але няхай яна, як духам хлебным,
напоўніць вольным духам Перуна
маіх касьцей сырыя пустакі.
Што ж, я такі:
ад самае калыскі, яшчэ не распазнаўшы
белы сьвет
і ў ім сябе, я стаў падоўгу доўга заглядацца
на кроплю чыстай ранішняй расы,
якая распадаецца паволі
ў асмужаным трохкутніку ядлоўца.
Яшчэ гады мне падказалі слоўда
таемнае і моцнае, зь якім
я мог у сьвет ісьці, нязнаны й дзёрзкі,
але абавязаўшыся вярнуцца
аднойчы ўраньні ў росныя лугі.
Таемнае мне слова нагудзелі
чмялі і пчолы, восвы, а яшчэ
(была тады, здаецца, што нядзеля)
і сонны вожык на сырой жарсьцьве.
Я спазнаваў прыроды элемэнты,
адрозьніваць вучыўся верасы

ад чабароў і мяккай дзеразы.
Я гаварыў ім столькі кампліментаў –
расьлінам і зьвярам без выключэньня.
І ўсё гэта за кропельку расы,
за права сузіраць яе штодня.
Радня
мяне шукальнікам назвала
за вечныя бадзяньні і за ўпартасьць.
Ня ведала яна, што мая вартасьць –
быць братам яшчарцы, шаптацца з воўчым
лыкам,
на крык знаёмы адзывацца крыкам
сярод начы, калі гудуць хрушчы,
зьнішчаючы
спакойна
хларафіл;
любіць і матылёў, і дразафіл;
любіць спачатку дождж, а потым – сонца,
калі яно гуляе ў кроплях спрытна
і зайчыкаў пускае на казюрак,
і сьлепіць вочы сонным кажанам;
любіць расу вячэрнюю на сконе
дня доўгага,
калі з балотаў цягне халадком;
любіць прыроды чын і беззаконьне,
любіць, калі раптоўна град-і-гром...
Калі, зубоў прарваўшы белую ахову,
язык мой схопіць кроплю ранішняй расы
так далікатна, што не здрыганецца
ружовы гіяцынт, – тады паўстане
з трохкутнае прасторы новы дзень.

## МАРФАЛАГІЧНАЯ ДЭСТРУКЦЫЯ ГАЛАВЫ Ў САКАВІКУ

Нахабна перапоўнены мой рот
сфэральнай кубатурай белых іклаў,
спаміж якіх дыміцца жарсьцю кнот,
а з паднябеньня рвецца крык асіплы,
альбо такі, што рве мэмбраны мас,
альбо такі, што распранае фурый...
Мой кнот-язык, мой сакратычны пас,
вывужвайся, вызьмейвайся на Юр’я!
І ты, мой дзень, не пакідай наш пост,
пакуль матор пампуе кроў у вены.

Яшчэ нам рана думаць пра пагост,
яшчэ ня ўсе пражыты перамены.
І ты, кадык, адамаў хрумсткі фрукт,
не падвядзі падчас, калі прамову
я буду прамаўляць і есьці з рук,
пяшчотных рук з брутальным пахам змовы.

## ГАРЫЗАНТАЛЬНАЕ ПЕРАМЯШЧЭНЬНЕ СКІВІЦ

Рух сківіц па гарызанталі
здараецца, і ня рэдка:
калі вас на фронт забралі
альбо падвяла німфетка;
альбо калі рэжуць словам
ці проста душаць краватам,
ці ўпарта частуюць пловам
з чырвонага супэрфасфату;
альбо калі кават кахаюць,
але кахаюць бяздарна;
альбо калі брудна лаюць,
альбо калі дождж і хмарна.
Рух сківіц па гарызанталі
заўсёды мае прычыну:
напрыклад, каханьне ўкралі,
і нельга вярнуць жанчыну.
Ну, тую, што мае класны
клясычна-раманскі профіль,
і позірк скразны і ясны,
і хуткі вішнёвы «опэль».
Рух сківіц гарызантальна –
рэакцыя на праблемы,
на тое, што лёс фатальна
злучае ня тыя клемы.

## МІМАЛЁТНЫ ЭКСЦЭС ЗЬ ЕВАЙ БРАЎН

Ты ўсё яшчэ прывабная,
і ціхая, і здольная,
таемная і зграбная
па-свойму, і свавольная.
Але і новай рысаю
твой позірк перакрэсьлены.
І штосьці непамыснае

глядзіць зь цябе нявесела.
Пакінь жа ўсё, што зроблена
ня так, як бы хацелася.
Жыцьцё ня любіць згорбленых,
яно спрыяе сьмеласьці.
Падай мне рукі-рэчанькі –
я патану ў іх вуснамі.
Мы станем недарэчнымі
і крышачку распуснымі.
І ты часьцей задыхаеш,
і мне ўваччу зацемрыцца...
Старыя душы выхрысьцім
і ў новыя абернемся.
І зноў у крузе сонечным,
крыжуючыся ў свастыку,
мы стомімся, як гончыя,
мы зафіксуем пластыку.
Над намі водар аеру
ўсплыве, засьцерагаючы
ад бліскавіцы карнае
і перуноў канаючых.

## А ДЗЕНЬ СТВАРЭНЬНЯ АРГАНІЗАЦЫІ «ПРАВЫ РЭВАНШ»

Маэстра Картасар, як добра, што зайшліся.
Я вам якраз пішу, чытаў «El Examen».
А ўчора дрэнна спаў, і ўпартае «ніх шысэн»
вярзлося мне ўсю ноч, а потым –
«русский плен».

Ах, д’ябал! Не магу прапанаваць вам кавы.
Ёсьць, праўда, па сто грам. Тутэйшы алкаголь.
Як? Вам не прывыкаць? А нашыя аблавы?
Дарэчы, хто вам даў для сувязі пароль?

Палкоўнік Габрыэль? Ён сьніўся мне таксама.
Ён безумоўна наш. Ён нават больш, чым мы.
Ёсьць спадзяваньні, што нам дапаможа Замак
нарэшце дапісаць пачатыя тамы.

Маэстра Картасар, а што, калі няўдача?
Вы ведаеце, я... Так хочацца пажыць!
Мне часта сьніцца сон: жанчына горка плача,
а зь белага пляча крыніца-кроў бяжыць.

Што могуць азначапь такія мроі? Здраду?
Блакаду нашых сіл на ўсходніх рубяжах?
А можа, трэба мне ў варожы тыл з атрадам
прайсьці, каб уступіць у бойку на нажах?

Прызнаюся, што мне зусім не даспадобы
сучасны мэханізм вайны і перамог.
Мне цяжка назіраць, як гінуць без хваробы,
як слабая рука скубе зялёны мох...

Аднак, адкінем прэч эстэтыку забойства.
Маэстра Картасар, нам заўтра выступаць.
Пастаўлены задачы: Шэры Дом, Пасольства
бяз шуму і ахвяр за сем хвілін узяць.

У гэты ж самы час каманда «А», Маэстра,
павінна прачасаць наш «дзёрзкі» Тэлецэнтр,
Хай адпачне эфір да летняе фіесты.
Хай пагуляе ў ім вятрыска перамен.

Нішто ня спыніць нас! Жаўнеры ўжо гатовы.
каб вуліцы заліць шыхтамі чорных рот.
Дык з Богам, Камандант! Ня трэба многа
словаў.
Няхай гучыць іх два: ідзе ПЕ-РА-ВА-РОТ!

# З кнігі «Каханьне пад акупацыяй»
*1996*

## КАЛІ ЯНА ПАКІДАЕ АРГАН

Іграючы ў белым касьцёле,
кахаючыся з ксяндзом,
жанчына марыць у полі
застацца на ноч з касцом.

Іграючы штосьці з Баха,
жанчына імкнецца туды,
дзе весела-вольна птахам,
дзе многа чыстай вады.

Заціхлі гукі. І клірык,
забыўшыся пра Хрыста,
самотна, як юны лірык,
чытае ёй верш зь ліста.

Жанчына зьнікае з хораў,
жанчыне абрыд арган,
жанчына едзе на мора
і там заводзіць раман.

Жанчына ажыццяўляе,
што мусіць ажыццявіць.
на хорах арган сьціхае
і доўга жанчына сьпіць

* * *

Я чуў, каханая, што ты будуеш дом,
вялікі дом для ўласнага сямейства,
а твой ваюе рыфмамі са злом,
спаўзаючы пацíху ў фарысэйства.

Я ведаю цяпер, што помніш ты
зьнікомую пару сустрэчаў нашых –
супольны шлях да пляцу (дзьве вярсты),
злучэньне рук і хвойны водар фашын.

Тады таксама будавалі дом:

рабочыя раствор мяшалі ў цэбры
і квэцалі ім цэглу, і нагбом
ваду пілі – жалезістае срэбра.

А мы блукалі побач. Нам было
цікава назіраць за ростам сьценаў
і думаць, як праз нейкі час жытло
завершыцца страхой і жменяй зерня,
якое гаспадар па сьвежых дошках
рассыпле, згодна звычаю дзядоў.

Ты не была маёй тады і потым,
бянтэжыла цябе, што я жанаты,
што не з табой ляплю сямейства соты,
хоць ты пайшла б са мною і за краты.

Бягуць гады (банальная раскладка):
мне трыццаць тры, ты замужам нібы,
ды кожны раз, калі занадта гладка,
мы заадно і прагнем барацьбы.

## ТРАЕКТОРЫЯ НЭРВОВАГА ЦІСКУ

Кідаеш позірк на мяне
дыяганальна.
Табе 13. Ты – сама антыбрутальнасьць.
А мне ўжо 33, дзяўчо,
я злосны, брудны,
каторы дзень баліць плячо
і голас нудны.
Але і я насустрач дню
гляджу з хітрынкай,
і юны позірк твой лаўлю,
нібы разынку
у чорным хлебе нашых дзён.
Сэнтымэнтальнасьць
яшчэ наведвае душу
маю часамі.
Ты засаромелася і
вала-
самі
прыкрыла шматаблічны цік
воч, вуснаў, шчочак...
Глушу ў грудзях ільвіны рык

і стаўлю про-
чырк –.
Я палюбіў цябе, дзяўчо,
маніякальна,
каб сьціхла хворае плячо,
каб нешакальна
жыцьцё працягваць,
жыць далей
з нэрвовым цікам
і між наструненых грудзей
зьвівацца сыкам,
а потым ціха запаўзьці
ў трохкутнік
тваіх бэрмудаў
і там навечна прарасьці
сакральным цудам.

* * *

Зьнікла энэргія слова і цела,
і засталося вяршэнства сноў.
Божа, як непасрэдна хацела
гэта жанчына маіх замоў.

Як жа шаптала яна: «Ты прелесть...».
як жа прасіла: «Ещё... люби...».
і перманентна ішла на нераст
з мора шартрэзу ў раку шаблі.

* * *

Не магу, не хачу адмовіць,
калі просяць вочы твае,
калі рукі пяшчотна ловяць,
твае рукі ловяць мае.

Сёньня твой, я сьцялю нам ложак,
выдзяляючы эндарпін;
я твой бог, твой д'ябал бяз рожак,
муж любімы твой, бацька, сын.

Я прыйшоў. Ты рабі, што трэба:
расцалуй альбо прагані,

альбо выплаві зь мяне срэбра
на сваім залатым агні.

## КРЫЗАСТОМІЯ

Хвароба ўзрэзала мне
філязаВІЧна;
шукаюць штосьці дактары
апалітычна;
пацялі вэртыкаль маю
гарызантальна;
я лекі п'ю, я не пяю,
што ненармальна...

Адмоўна – сьведчыць Васэрман.
Я ажываю,
я зноў гатовы на таран,
бо зноў кахаю!

## СЭНТЫМЭНТАЛЬНАЯ СУСТРЭЧА НА ЛІНІІ АГНЮ

Я гляджу, якая ты сьветлая,
ты стаіш у промнях у сонечных,
папраўляючы кабуру пісталетную,
са знаёмымі пра штосьці гамонячы.
Я таксама папраўляю партупею, рэгаліі,
каб да цябе падыйсьці, паздароўкацца,
але
кулямётнай стужкай ты, нібы каралямі,
бліснула насустрач мне, папярэдзіўшы:
не высоўвацца!
І я стаю, чакаю каханую,
боты мае юхтавыя прыемна рыпяць,
стаю, трамбую зямлю ханаанаву,
каб заўтра снарадамі цёплую араць.

І вось паклікала мяне любачка
(а жоўтыя патрончыкі з ражка пок-пок
на травачку зялёную, як фасоля на сподачак),
паклікала й сама зрабіла першы крок.

І вось ужо разам ты, я і рэгаліі,
і прэч кабуру, і партупею з плеч!

І неяк раптам нікнуць вайны рэаліі,
бо ў рукі свае белыя бярэш ты помсты меч.

Люблю я гэту зброю, дальбог, непераможную,
халоднай яе ніяк не назавеш,
выходзь на поле бітвы зь ёй хоць ночку кожную,
хоць заваёўвай тысячы белых веж.

Гляджу, гляджу, каханая, якая ты сьветлая,
сташ пад поўняю, пад сонцам ці дажджом,
і ўсё табе пасуе – хоць кабура пісталетная,
хоць новы аўтамат, хоць старое ружжо.

## ОДА ЖАНОЧЫМ ВУСІКАМ: ЯК ЭРАТЫЧНАМУ СЫМБАЛЮ, ЯК ЗНАКУ ЖАНОЧАЙ МУЖНАСЬЦІ, ЯК ПРЫЧЫНЕ МУЖЧЫНСКАГА НЕСПАКОЮ

Для вока пільнага прыкметны,
пяшчотны чорненькі пушок
над верхняй вуснаю эфэктна
зьявіўся, каб наводзіць шок
на юных, ведама ж, паэтаў,
і на мужчын ужо ў гадах.
Ён, відавочна, быў апеты
недастаткова. Сам алах
і трыадзіны праваслаўны
любілі часам назіраць
за цёмным пасачкам над вуснай
стварэньня божага з касой,
за тым, як лёгка, без прымусу
ён пакрываецца расой,
калі жанчына жарсьці смагу
з законным мужам спаганяе,
а потым крыху спачывае,
прыкрыўшы белую нагу
артадаксальнай прасьціною,
другую ж зьвешваеш на дол
з канапы шлюбнай.
Ах, з усьмешкай
пад рымскім носам чорны вус
блішчыць у сонечным сьвятле.
Ён падабаецца і мне.
І з гэтай дзіўнае прычыны
так жыць сьпяшаюцца мужы,
чмялі, андатры і вужы,

ваўкі, тарпаны і смаўжы,
буслы, вароны і стрыжы,
і мноства іншых біямас.
Дык слаўся, чорны вусік-пас,
блішчы пад промнямі ў расе,
спрыяй жаночае красе!

* * *

Зайшла. Расказала пра мужа,
аптэку, праблемы дачкі,
згадала, што трэба стужак
чырвоных купіць і гаршчкі
пад кветкі (растуць яны хутка,
каму ж, як ня ім, расьці?).
Шапнула: «Гуляе чутка,
што могупь па вас прыйсьці».
«Напэўна. І ўжо хадзілі...
Ды што нам стаяць вось так?
Пакуль яшчэ не пасадзілі.
давайце мы зьдзейсьнім акт.
Давайце накрыем белым
казённае кана - пэ
і нашым супольным целам
мы вылажым ворагу «фэ».
Пакуль ён стаіць за дзьвярыма,
мы будзем спружынай рыпець
і пахнуць любоўным зарынам,
і плакаць, і ксьціцца, і пець.
Вы згодны з такім праектам?»
«Я згодна, давайце зьдзяйсьняць:
я буду вашым аб’ектам,
які неабходна кахаць...»
І так мы любіліся доўта,
а ён за дзьвярыма стаяў
і кляў на чым сьвет свайго бога,
пакуль канчаткова ня зьвяў.
У дзевяць мы выйшлі з кватэры,
зірнулі на скурчаны труп
і сталі сьмяяцца бязь меры
спакусьлівым сьмехам сукуб.

* * *

Калі ты здрадзіш мне аднойчы,
ад гэтай здрады атрымаўшы
так многа-многа асалоды;
калі ты прыйдзеш, пераспаўшы,
калі суцішыш свае воды
з тым, іншым, мне зусім ня братам,
з тым чорным, белым, жоўтым фатам;
калі ты прыйдзеш ці ня прыйдзеш;
калі, ўнікаючы сустрэчаў,
ты начавацьмеш у сябровак,
альбо ў сяброў, альбо ў прылеску,
альбо ў пясках зімнога мора, –
я не павешуся ад гора,
як, зрэшты, і не расьсьмяюся.
я не пайду і не ўтаплюся, –
я ўспомню, дзе ляжаць набоі.

* * *

Ты ведаеш, а сьнег яшчэ пякнейшы,
чым думалася нам
там,
у аўсах
над Зах.
Дзьвіною.
Ты мне раўня,
радня,
і лёс мой я хвалю за тое,
што люблю
радовішчы тваіх
вачэй начных,
я, золатаздабытчык, мніх,
на берагах рачных
любоўнік сталых і дружок малых,
і маладых.
Пакуль я не заціх,
я буду пры варштаце, пры такім,
які рабіцьме пекнату ў кантэксьце
тэрарыстычных актаў у мэтро
і хіматак у мэрыях і банках.
Ты ведаеш, так файна быць з табой
і вызваляць твой рот ад успамінаў

пра тых, што цалавалі проста так,
бо думалі пра як бы зьдзейсьніць акт.
А як прыемна ціха аддаляць
ал лёгкай павуціны летуценьняў
жанчыну маладую, каб кахаць
магутна, па-сапраўднаму, бязь ценяў,
бязь церняў здрады, доўга і заўжды
яе кахаць;
любіцца так, як любяцца жыды
з уладай і грашыма ва ўсім сьвеце.
Як гэта класна, клёва, проста ў кайф
цябе любіць на самай верхняй ноце,
на адпачынку, дома, на рабоце...
Люблю цябе татальна, як тэрор,
як бомбу з плястыку, якая ліквідуе
таго, хто нам закрыў шляхі да зор
і дух наш вольны разгайдаць спрабуе;
люблю ізноў, спачатку, ад яйка,
як некалі казалі лаціняне;
люблю цябе, як рэзкі ўдар клінка,
як белы бінт на лёгкай чыстай ране.

* * *

Ты плывеш са мною побач
у натомленай прасторы
паміж дрэў экстравагантных
у чырвоных каптурах.
Кроны дрэваў прагнуць глебы,
чарназёму, глею, глейсу;
дрэвы мусяць размнажацца,
а таму штогод увосень
лістападам, лістападам
заварожвае прастору.
Дык плыві, мая сяброўка,
побач я, і мы жадаем
гэтаксама плоднай глебы,
а яшчэ – пяскоў гарачых,
а яшчэ - блакіту неба,
мора сіняга і сонца
многа-многа, і салодкіх
кавуноў, мундэраў, вішняў,
каб у соках садавіны
і гародніны знаходзіць

падтрыманьне нашым сілам.
Мы жадаем больш, чым дрэвы,
мы жадаем плоду, плоймы
самых розных штучак дзіўных.
І ня дзіва: мы ж з табою
прыналежым да людзкога
роду-племені, а гэта
значыць, што, акром зямліцы,
трэба нам азону, волі,
каб маглі мы плод здаровы,
чысты, крэпкі, без кароcты
данасіць да свайго часу.
Ах, сяброўка! Плаўна, плыўна,
мы плывём з табою ўпрочкі.
Мы кахаемся, як людзі.
Львы прыгожыя ня могуць
так кахацца, вось і мала
іх на сьвеце, львоў прыгожых.
Дай жа мне, маё прыняўшы:
выйдзем разам з акіяну,
станем сохнуць на ўзьбярэжжы
нашых стомленых пачуцьцяў.
Суму актаў мы завершым
актам паглынаньня ежы.
Як звычайна, будзе многа
птушкі, рыбы і мучнога,
кавы, чаю, вінаграду,
крыху лёгкага віна.
Мы адновім вашы сілы,
пульхнасьць нашых вуснаў, губак,
каб злучыцца зноў і разам
наша ўсё пачаць спачатку.
Дык плыві, мая сяброўка,
побач я, і мы жадаем.

## ЛІТАНІЯ, АЛЬБО ЗАПРАШЭНЬНЕ ДЗЕВЫ НА БЕЛАРУСКІ ПАСАД

І стаю цяпер прад Табою, нікчэмны я, а Ты не адпрэч. Выслухай, пачуй і прыйдзі. Мужчыны нашыя ўпалі духам дазваньня. Ня могуць яны больш народ бараніць свой. Ня могуць, няшчасныя, заступіць дарогу водам мора чужынскага. У пустэльні пяскоў, імкнучых з усходу, патанаюць іх корды. У плазме атрутнай, што з захаду льецца, замёрлі іх душы. Гора ім, гора мужчынам нямужным і слабым! Гора народу, які сваёй ганьбы ня бачыць! Зьлітуйся, Дзева! Прыйдзі, прывядзі свае войска дзеваў нямужніх і жоначак мужных

прыгожых. Станьце як сонцы, з абліччаў лініце на Край наш ясныя промні красы і пяшчоты, і ласкі. Веру, пад гэтымі промнямі ўздымецца новае племя. Белай рукой дабраслаў Ты яго на змаганьне, але й сама не сыходзь.

Дзева Красы, Абароны і Вечнасьці нашай! Патрыярхату ўладу вяртаем Табе, бо зьнядужалі грэшна, бо запавет нашых продкаў ня спраўдзілі і адступілі. Вось я, зьнячэўлены, ніцма ўпаў прад Табою, нікчэмны між іншых нікчэмных. Карай любою карай, але дай потым шанц для рэваншу. Дзева палескіх абшараў, модлы мае за мужчынскі ваш род не адпрэчвай. Мы яшчэ зможам, мы здолеем, толькі зьявіся. Мы паклікаем Цябе на Пасад Беларускі. Зь вераю ў наша паўстаньне зь нябыту. Мужчыны.

## АНТРАПАМОРФНЫЯ ТРЯНСПЛАНТАЦЫІ З ГРААЛЕМ НАПЯРЭДАДНІ ЖАНОЧАГА ЦЫКЛЮ

Колькі я прыручаў цябе,
колькі вучыў любіць,
колькі цела тваё вялікае
я мусіў начамі сьніць.

Колькі часу я думаць думаў,
што гэта і ёсьць ты,
жанчына мая разумная,
ратавальніца ад немаэты.

Колькі табою кляўся я
апаўночах і апаўднях,
і зь іншымі спаць ня клаўся,
і быў мне ня страшны страх.

Начамі, заліты спэрмаю,
я памятаў пра цябе,
табой, а не праблемай кватэрнаю,
жыў я як пан бог бек.

Вось чаму, табою забраны,
як штык-нож, як шабелькі сталь,
я люблю і цалую, і ў брамы
ўваходжу, нібы Грааль.

# АЛЖЫР

## I

Гэта музыка заўсёды з табою,
з табою, што б ні рабіў ты,
куды б ты ні бег, куды ні сьпяшаўся.
Гэта музыка паміраючай хаты,
шашаль яе патачыў, і пацукі
за абшыўкай фанэрнай, і вечная
асеньняя муха, нейкая мхастая,
як з моху, калі быць дакладным
у параўнаньнях і не злоўжываць наватворамі.
Гэта музыка заўсёды з табою,
бо хіба ты можаш забыцца,
хіба ты можаш ня памятаць,
як трашчыць сухая фасоля ў струках,
як перакочваецца сухое зернейка ў гарэсе,
як трашчаць дровы ў печы,
якая стаіць у тваёй беларускай хаце,
у тваёй хаце, бо ты нашчадак
старога крывіцкага роду,
які тут адвеку
і будзе.
І музыка, гэта музыка,
якая заўсёды з табою,
бо ты і цяпер вось чуеш,
як бацька настройвае радыёлу «Riga»
(хоча злавіць «Свободу»).
Ах, якая гэта цудоўная музыка,
але яна занадта гучная
і маці ня можа заснуць,
а я на тыле шафы,
нібы ў ноты ці ў пропісі,
крэсьлю першыя знакі.
Адтуль плыве гэта музыка:
чуеш, як цела жанчыны
валіца на падлогу,
чуеш удары нагамі
і крык, і хрыпеньне жаночае,
і горлам жаночая кроў,
і потым усё сціхае.
Ах, дайце ж гэтае музыкі,
якая заўсёды з табою:
гудзяць залатыя хрушчыкі,

вуркоча сабака Мухтар,
бо сьніцца яму Мухтарыха;
карова рыміць, бо нядоена;
Мурка гавэньдзіць,
бо ёй ніхто
у кансароўку з-пад кілек
не налівае млека,
бо ў хаце тваёй беларускай
твайго крывіцкага роду
ляжыць нерухомае цела
і стынуць удары нагамі.

**II**

Мне сьніцца Алжыр,
а можа
мне сьніцца раскошная Індыя,
і я ўмураваны ў фундамэнт
Храму Каханьня Арыйскага.
А можа мне сьніцца Кенія,
тамтэйшы горад Найробі,
дзе абсалютна да фені мне
вашы тутэйшыя фобіі.
Мне сьніцца паўвыспа Юкатан,
я ўздымаюся на Кракатау,
а потым я лава і попел,
танцую шалёны канкан я
і закладаю заставу;
я жыву на вяршыні вулкану,
тут цэзій кожнае раньне
высейваецца на пароду,
як раса выпадае штораніцы
на мхі беларускіх балот;
тут лава заўсёды цёплая,
як цёплым палок быў
пасьля твайго дзеда,
і ты на цёплыя ўзлазіў дошкі
дасьніваць дзіцячыя сны,
а дзед завіхаўся ў дварышчы
(любіў ён работу з дрэвам).
А потым прыйшлося мулка мне,
бо дзед аднойчы астыў,
і дрэва яго не сагрэла,
і стаў халодным палок.

## III

Весела мне на Юкатане,
дзе плешчацца мора лавы,
дзе на вяршынях вулканаў
прарастае папарацъ кветка
і нашы крывіцкія мхі.
Весела тут, бо перамяшчэньне
ёсьць тое, чаго мне жадаецца,
люблю я
працэс пэрманэнтнага прырашчэньня
новых боляў, крыўд і каханьняў.
Я запаведнік, і пераплаўляю я
фэкаліі вашых дурнотаў, вы.
І толькі ўласныя гульні гуляю,
рызыкуючы застацца без галавы.
Няхай жа сьняцца мне бомбакідальнікі,
хачу я бачыць вольным Алжыр,
хачу прысьніць, як мае начальнічкі
валакуць на Галготу свае крыжы.

## IV

Мы - салдаты, таму мы мусім быць са зброяй,
здабываць зброю,
вырабляць зброю,
берагчы зброю.
Наша філязофія знаходзіцца на вастрыі клінка.

## V

Мы любім горача халоднае лязо,
няхай па ім сьцякае кроў ахвяры,
каб вольна жыць і спраўдзіць нашы мары,
мы адназначна выбіраем зло.
Але для нас, для нас яно дабро,
злом ёсьць яно для ворагаў Айчыны.
Паставім здрадзе піку пад рабро
за герб, за сьцяг ды іншыя злачыны.
Пячыся, сука, падла, на нажы,
энэргію спазнай беларусінаў,
а служкаў ейных, навалач і псіну,
закінем у пушчанскія лаўжы.
Мы шыхт у шыхт ідзём, і наш клінок
гатовы ўзрэзаць ворагу вантробы.

Мы не баімся арыштанцкай робы,
мы за Радзіму робім гэты крок.
З дарогі, страх! Зашыйцеся ў нару,
гайня інтэлігентных імпатэнтаў.
Гару бяруць, сягаючы ў гару,
і тыя, хто гатоў да інцыдэнтаў.
Мы шыхт у шыхт... Устаўлены запал,
глядзець за гарызонт прыцэл і руля.
І фаўст-патрон рахуе: ці прапаў,
ці панам буду, калі схібіць куля.
І вось прыйшлі. Займаем нумары.
Яшчэ пясок не разагрэла сонца,
яшчэ раса, і сьвет такі бясконцы,
і сьпяць у пад'яленцах камары.
Хвіліна-дзьве - і «пяты» распачне,
затым «сямёрка» паласьне канкрэтна,
пасьля імпэтна шухне эРПэГэ,
і дух кладоў адчуецца ў паветры.

**VI**

Вось і ціха стала. Цішыня.
Наразная стыне ў хлярафіле.
Нашай стала ўрэшце вышыня,
мы яе сабой усю накрылі.

**VII**

Хата. Род. Гняздо. Мы птушкі,
мы пакінулі наш дом:
на фатэлі пыл і стужкі,
недапіты ў бутлі ром,
абразы старыя, цьмяныя,
крыж з расьпяцьцем, сьцяг Літвы,
этажэрка і парваныя
школьных пропісяў лісты.

**VIII**

Ідзе наступленьне на новыя пазіцыі.
Што будзе заўтра, пакажа час.
Той, хто пераможаны, пакідае амбіцыі.
Новыя атакі чакаюць новых нас.
Пад шквальным агнём, пластаючы зямлічку,
з раніцы да вечара ў кожным лесе

мы прарастаем зялёнымі лычкамі
вечнай травы у бліскучай расе.

* * *

Каляды. Посная Куцьця.
Ня піша пісьмаў Арганістка.
Вісіць над установай сьцяг
усенароднага фашыста.

У пераходах прадаюць
падпольную літаратуру,
якую ў Вільні выдаюць
мне невядомыя структуры.

Зіма крыху. Сьняжок ледзь-ледзь.
Бамжы акупавалі крамы,
дзе можна целы свае грэць,
наколкі сінія і шрамы.

Зіма! Вярнулася, дальбог!
Іду з прагляду «Мадэрністаў»,
і кліча штосьці за парог,
у запарожжа рэканкісты.

* * *

Я паганы, мне добра з поганьню:
воўк шалёны і ліс худы
мне сябры, зь імі разам гонямі
я бягу да жывой вады.
Мы на ўсход нашы морды ўскінулі,
нашы лапы ўздымаюць пыл,
мы жывём, мы яшчэ ня згінулі,
і бяжым не з апошыіх сіл.
Сухажыльлі напяўшы патава,
прарываемся напрасткі,
адчуваючы кожным атамам
нашы крушні, ральлю, пяскі.
Мы расістыя, мы рассаднікі
новай волі, нам трэба шмат.
Абмінаючы палісаднікі
мы бяжым на прастор з-за крат.

## ВЯЧЭРНІЯ МРОІ А ЭЛЕМЕНТАМІ ПАГАНСТВА

Нешта ёсьць у тым, каб глядзець
у расчыненае вакно.
і халодныя рукі грэць,
і нэрвова гартаць блакнот.
Нешта ёсьць у тым, каб дастаць
зь цёплых похваў лязо нажа
і, прыкленчыўшы, цалаваць
сталь халодную, і вужа
запускаць праз парог у дом,
і даваць яму малака,
і вымольваць у неба гром,
і прысьніць, як твая рука
нож трымае і не дрыжыць,
як стабільна цячэ рака
і банальна хочацца жыць.

# З кнігі «Сьпіраль Бруна»
*1998*

* * *

«Рукі назад!» – ты ідзеш на допыт.
«Рукі назад!» – ты дзяржаўны злачынца.
«Рукі назад!» – набываеш вопыт.
«Рукі назад!» – і думка, як сьпіца,

пра тое, што там красавік і суха,
дзяўчаты скінуді тоўстыя гетры,
на крушні яшчарка сушыць бруха,
і пахне гудронам асфальт нагрэты.

З рукамі назад выводзяць ва пляцык
трохкутнай формы – хадзі і думай
пра тое, як там дэфілююць грацыі,
як там парлямэнт фліртуе з думай.

Пра радасьць успомні, калі жанчына
цябе па-крывіцку любіла штоноч,
і вы любоў запівалі «чын-чынам»,
і сьлёзы сьветлыя беглі з воч.

А «рукі назад!» – гэта ўсё часова,
я «рукі назад!» – ня страшна, калі
табою валодае вечнае Слова
і памяць пра ліпеньскі пах ральлі.

*21.IV.1996. 9-я камэра СІЗО КГБ.*

* * *

Ах, проста блакітнае неба,
проста птушка пяе,
проста цёплая глеба,
проста сонца ўстае.

Проста цьвітуць пралескі,
проста жоўты пясок,
проста сьвежыя трэскі,
проста па дрэвах сок.
Проста сяджу ў вязьніцы,

проста ем баланду,
проста ніяк ня сьпіцца,
проста нікуды ня йду.

Проста сябры на волі,
проста і ворагі там,
проста цячэ са столі,
проста жыцьцё – бэдлам.

Проста хутка асудзяць,
проста буду маўчаць,
проста сумую па людзях,
проста хачу кахаць.

*28.IV.1996.*

**ПЕДЭЛЬ**

Педэль ходзіць за дзьвярыма,
педэль ведае дакладна.
як патрэбна службу правіць
у любых умовах часу,
у пару тэрору, гвалту,
летам, восеньню, зімою...
Педэль мае палку з гумы,
не турбуюць яго думы.
Педэль, наш любімы педэль,
безь цябе мы анікуды.
Дай нам, педэль, каб нам ведаць,
як хадзіць, глядзець куды,
як пазьбегнуць нам бяды.
У цябе пруток гумовы,
у цябе густыя бровы.
Педэль – гэта проста цуд.
Педэль – цаца. Педэль – гут!
Педэль слухае маўкліва.
Педэль – млын.
А мы ёсьць мліва?

*29.IV.1996. 9-я камэра СІЗО КГБ.*

## СУСТРЭЧА З АФІЦЭРАМ СМАРГОНСКАГА ПАГРАНАТРАДУ

– Дзень добры, палкоўнік! Я Славамір.
Будзем знаёмыя? – Будзем.
Трашчыць і рвецца ад гукаў эфір,
і рвуцца ад кашлю грудзі.

– Палкоўнік, прыступім. Вось карта і плАн.
Далей мы цярпець ня можам...
– Я ведаю, гэты паршывы клАн
Мы зьнішчым і пераможам.

– Выдатна, палкоўнік! Вы, бачу, наш,
сапраўднай касьці беларускай.
Вы будзеце нішчыць здраднікаў аж
нават на глебе рускай.

– Я буду, аднак жа, дзе нашы арлы?
Час «ч» мы павінны прызначыць.
Мы выступім ціха на самай зары,
пакуль вораг сьпіць на дачах.

Мы жаль і спагаду адкінем прэч.
За нашых жанчын і дзетак
мы будзем галовы варожыя з плеч
здымаць, як жытцо з палетак.

Атрады зьнішчальныя ўжо ў лясах,
чакаюць толькі загаду.
Што ж, кожнаму здрадніку свой пасаг.
Гатова ўсё да нападу.

– Палкоўнік, трымайце, вось вам рука,
рука не салдата – паэта.
І вып’ем давайце за колер кукард,
за бела-чырвоны. За гэта!

*9.V.1996. 9 камэра.*

## ЧЫСТАЕ

Яно жыве на паверхні,
на плоскасьцях каардынат,
на ніжняй вусьне, на верхняй,
пад сэрцам у нашых дзяўчат.

Іскрыцца яно ў зялёным
і ў жоўтым на сонцы блішчыць,
зрываецца кропляй з клёнаў,
у душах зьлёгку шчыміць.

Яно жыве ў пацалунках
крывіцкіх жанчын і мужоў,
у сьветлых дзіцячых малюнках
і там, дзе сьляды вужоў.

Жыве яно ў самым-самым,
на вейках нашых дрыжыць,
блішчыць у квадраце рамы
і на сталёвым нажы.

Яно жыве на сьвітаньні,
і днём, і калі паўзмрок,
і там, дзе нашы спатканьні,
і скрозь, дзе чуваць наш крок.

*19.V.1994. 9-я камэра «амэрыканкі».*

* * *

Кавалак чорнага хлеба,
нашага хлеба з нашага жыта
давай пераломім на дзьве палавіны –
табе і мне –
і абмочым у мёдзе
яшчэ не загуслым, яшчэ з пахам воску
і нашых прастораў.

Давай падсілкуемся, дружа,
насыцім нашыя целы
высокай энэргіяй пушчы
і гарызанталямі поля.

Пасьля столькіх дзён паміраньня
пахнуць дажджом навальнічным
рамонкі і мята ў букеце,
які нам прынесла інкогніта
жанчына з краіны кветак.

*23.VI.1996. Шпіталь КГБ.*

* * *

Жыць хочацца, бадай што, як ніколі,
тым больш любіць, тым больш, калі вясна,
тым больш, калі ў цябе дачка на волі,
тым больш, калі яе ў цябе няма...

*VII.1996. «Амэрыканка».*

* * *

Такая ціхая і сьціплая,
на шыі крыжык залаты,
вяртаеш ты мяне, асіплага,
зноў да жыцьця і пекнаты.

*1996. Шпіталь КГБ.*

* * *

Не гані пургу, начальнік,
я табе не крымінал,
я прыгожага шукальнік,
я – пачатак, ты – фінал.

Я ірву душу на часткі,
ты вязаць канцы мастак,
я ўнікаю хітрай пасткі
на ральлі, як чорны грак.

Эх, з кайданнага я племя,
кантралёр табе імя,
мае ногі прагнуць стрэмя,
твае рукі – рамяня.

І таму, як ні ўсьміхайся,
як мне ў вочы ні хлусі,
скажа некалі: «Зьбірайся!»
І табе ДэПээНСІ.

*6.VII.1996.*

* * *

Няма куды бегчы, таварыш,
закрытыя захад і ўсход,

падпісаны ордэр на арышт,
пастаўлены штамп: «У расход».

Настроены вораг рашуча,
ды толькі і ты не слабак,
і ўголас ты сьмела і гучна
гаворыш пра ўсё, што ня так.

Але ўжо і словаў замала,
і значыць настала пара
выходзіць насустрач вандалам
пад сьпеў партызанскіх гармат.

*27.VII.1996. «Амэрыканка».*

## МАЛОДШАМУ СЯРЖЯНТУ ВІТАЛЮ, СЯДЗЕЛЬЦУ 4-Й КАМЭРЫ СІЗО КГБ

Сядзіш за скрадзены цэзій,
а мог бы за Беларусь,
маўклівы і негарэзьлівы
барысаўскі беларус.

Яшчэ толькі ўчора быў ты
малодшы сяржант БэА,
у форму як быццам уліты,
як быццам ты ўжо камбат.

Яшчэ толькі ўчора... а сёньня
ты разам са мной сядзіш,
сьціскаеш роспачна скроні,
хістаесься ды маўчыш.

Ты думаў, што шыта-крыта
адбудзецца справа, аднак,
ня выйшла ў цябе са збытам,
і спраўдзіўся дрэнны знак.

І раз ужо так прыйшлося –
давай ня плакаць, ня ньць,
давай рабіць, каб збылося
усё, што павінна быць.

*12.VIII.1996.*

* * *

Канчаецца лета. Яблычны спас.
Пра Афрыку мараць птушкі.
Ах, як жа на волі прыгожа ў вас!
Ах, як жа за кратамі скрушна.

У вас там кажуць пра новы стыль
(«Прадай Радзіму» назвалі).
А мы тут гніём, як падвальная цьвіль,
як брудная пена хвалі.

У вас там нардэпы ідуць у бой
з «усенароднаабраным»,
а мы тут штодня становімся ў строй,
штодня залізваем раны.

Мы тут прырастаем грудзьмі да нар,
мы тут заціхаем дачасу,
а ноччу смакуем чыфірны ўзвар
усёй арыштанцкай расай.

На волі ў гародчыках астры і кмен,
нясьпелы агонь каліны,
а ў нас на прадоле нахабны мент
пагардліва цыркае сьлінай.

Яму дазволена, ён «круты»,
цяпер ён сіла і права,
а нам застаецца – грудзьмі на драты,
худым абліччам у гравій.

А нам застаецца нічога і ўсё –
турэмная вош і Радзіма,
і наша нянавісьць, зь якой мы расьцём
насустрач рэжыму.

*7.IX.1996. Віцебскі цэнтрал, камэра 60.*

* * *

Ізноў кастрычнік. Час пасадкі дрэваў.
На саджанцах раса дрыжыць,
а ты,
ты ўспамінаеш падарожжа ў Крэва,

значэньня стратэгічнага масты,
любімы шлягер, інтэрнат, свабоду,
турму, сабак, іржавыя драты,
супраціўленьне мужных, слабых згоду,
неадэкватнасьць зла і дабраты;
ты ўспамінаеш, як заходзіць сонца,
як на цэнтрал навальваецца змрок,
як з вымені каровінага ў донца
струменем б'е антысухотны сок.
Ах, памаць, памяць! Файная ўласьцівасьць,
яна табе ня дасьць асатанець,
яна сілкуе годнасьць і гідлівасьць
да усяго, што западло цярпець.
Ты ўспамінаеш, як цьвітуць вяргіні,
як лес шуміць, як асядае пыл
на жыта прыдарожнае, як гіне
блакітны чмель у белай конскай грыве,
як баба ў лазьні свой шаруе тыл;
ты ўспамінаеш, як шманалі «хату»,
як ты ня стаў з рукамі на сьцяну,
як дапамог тваіму блатному «брату»
жывот ускрыць, прачнуўшыся ад сну.

## У СУДЗЕ

Ізноў адклалі суд
(калядныя вакацыі).
На волі маразы,
у камэры смурод.
Радзіму прадаюць
мэтодай трансплантацыі
пад шыльдай індульгенцыі
пад назваю «народ».
А я, сяджу я ў камэры,
на мне фуфайка чорная,
на мне шузы ад фраера
і стрыжачка «пад нуль».
Нібы матор за бампэрам,
я сьцяўся, супакойваю
свой рухавік з прадсэрдзямі,
у страўніку шумы;
ня лаюся з суседзямі,
і толькі дух настройваю
паводле верша ўласнага

на хвалю барацьбы.

*26.XII.1996. У боксе Віцебскага абласнога суда.*

**ЁН**

Бойся яго, ня бойся –
ён побач, і над, і пад.
Штодня ён прыходзіць у госьці,
твой самы «старэйшы брат».

Ён любіць тваю жанчыну
і вечна прагне яшчэ,
ён ходзіць крокам качыным,
альбо як дровы сячэ.

Спакойна яму і сьпіцца,
і соладка п’ецца яму,
тутэйшы начальнік паліцыі
яго ня кіне ў турму.

Ён любіць гасіць плявочкамі
агмені самотных душ
і пільнымі шэрымі вочкамі
глядзець скрозь садовы плюшч.

Ён пляга твая адвечная,
штодзённы твой госьць у дом,
і ты, як лаза надрэчная,
праходзіш праверку на злом.

* * *

Студзень. Спачатку марозны,
потым адліга і бруд,
потым кашаль грыпозны,
карцэр, камэра, суд…

*27.I.1997.*

## «Дрэва нашай свабоды»
*1997-1998*

* * *

Ад пераможных нашых радкоў
няхай панясе душа Рэвалюцыі
дзеля таго, каб новая кроў
сцьвердзіць магла закон эвалюцыі!

* * *

Рабі ГЭТА са мною
кахаючы і прыгожа,
пад елкай альбо сасною,
альбо запрасі ў ложак.

На белыя прасьціраддзы
кінь мяне, распрануўшы,
я буду бязьмежна рады
пакінуць граніцы сушы.

Я плюхнуся ў воды мора,
у акіяны субстанцый,
чытацьму цябе, як Тору,
як Біблію, мая Канстанца.

Я перацалую пялёсткі
тваёй залацістай ружы,
я, гэткі малы і порсткі,
і слабы з табой, і дужы.

Глядзі, вось нашае заўтра –
пасьля здабыцьця свабоды
мы пішам вялікую хартыю
нашай любоўнай згоды...

Дык зьдзейсьні ГЭТА са мною,
мая беларуская вершніца,
і праўдай, а не маною
няхай наш прыплод прышчэпіцца.

*4.V.1997. Купа.*

* * *

Каханьне бяз рэтушы, голае, галоднае,
за кратамі ў камэры альбо на прадоле,
каханьне пад прыцэлам, сырое, падкалоднае,
цяжкае, нібыта царкоўная жырандоля,
каханьне маё прышлае, імгненнае, тутэйшае,
я нацкую на плоць тваю лягавых маёй жарсьці,
я расьпішу цябе прыгожымі і дзёрзкімі вершамі,
ня дам табе спакою да самай нашай старасьці.
Пакуль я буду лёгкімі сіпець на цэнтрале,
абкураны і добраю, і дрэннай табакай,
хадзі сабе сьмела ў памаранчавай залі,
зусім ня так, як ходзіць камандзір перад атакай,
але як толькі выйду я, як толькі я звольнюся
з турмы, дзе забіваюць павольна і ўпэўнена,
мы паплывём з табой у белым ад полюса да полюса,
мы станем любіцца і слухаць Ленана,
мы будзем, як дрэвы, што мной пасаджаны
за тысячы дзён да вершаў і славы,
мы будзем добрымі індыйскімі раджамі,
будзем языкамі пякельнай лавы,
мы будзем выліваца з кратэраў гневу,
з каналаў нянавісьці да акупанта,
мы зьнішчым яго нашым гімнічным сьпевам,
а рэшткі змыем з дапамогай гідранта.
І толькі потым, пасьля мы зоймемся каханьнем,
мы будзем выраблять – о Божа! – такія штукі
што адшукаюць нас, магчыма, позьнім раньнем
і целы яшчэ цёплыя возьмуць на рукі.

* * *

Чагосьці не хапае пэрманэнтна:
то H2O, то хлеба, то віна,
то «зайчыка», то «марачкі», то цэнта,
але ўжо ў гэтым не мая віна.
Чагосьці не хапае, ды найболей
гармоніі бракуе тут і там,
каханьня і сям'і, і першых роляў,
бязбацькавічам – родных тат і мам.
Чагосьці не хапае надзвычайна:
то розуму, то жарсьці, то сяброў,
гатовых біцца з ворагам адчайна,

нягледзячы на страты, боль і кроў.
Чагосьці не хапае без надрыву,
чагосьці не хапае толькі ў снах,
і не хапае шчырага парыву,
і сьмеласьці, калі навокал страх.
Чагосьці не хапае, ды найболей
гармоніі бракуе там і тут,
і праз пару, на жаль, самоты й болю,
і не сьціхае дождж людзкіх пакут.

* * *

Сярод аўтакефаліі бароў
стаіць мой стод пад бліскавічным небам,
на камені блішчыць сьвятая кроў,
сьцякаючы пяміж він ом і хлебам.

## ЯНА

Яна гэта робіць з жарсьцю
белай арыйскай жанчыны,
калі цьвітуць гіяцынты,
калі выпадае сьнег,
так, што ў варожай крыві
стынуць эрытрацыты,
і ў сьлёзы ператвараецца
нахабны чужацкі сьмех.
Яна заходзіць у храмы
акупаванай Краіны,
дзеліць хлеб насычэньня
і прыгубляе кагор
за вольнае перамяшчэньне,
за сонца зь вяршыняў гор.
Яна заходзіць у храмы,
убраныя ў золата восені,
кладзе на камені капішчаў
сьвяты крывіцкі агонь
і просіць за нашы правіны,
у нашага просіць Бога,
маленькую ўзьняўшы далонь.

## КАЛІ ТЫ ВЕРНЕСЬСЯ ГЕРОЕМ

Калі ты вернесься Героем,
і на Багатую Куцьцю
вакол цябе зьбярэцца роем
натоўп у строях ад куцюр,
і крышталёвы ў тонкіх пальцах
падыме келіх дама пік,
ты ўспомніш пра самотных мальцаў,
турэмны шмон, правёж і крык,
успомніш карцэр, краты, рэшку,
этап, канвой, сыры прадол,
і келіх выпіты, як пешку,
паставіш на раскошны стол.
А на двары старое дрэва
страсе каляны чорны ліст
пад сьцены зьнішчанага Крэва,
пад ветру дыхавічны сьвіст.
Калі ты вернесься Героем
у белы сьнег, пад Новы год,
уборы вольнага пакрою
табе зладуе наш народ.

*1.XI.1997*

## ПРЫГОЖАЕ

Прыгожае – гэта пальцы
тонкія ў срэбных пярсьцёнках,
і пальцы, якія на пляцы
фармуюць кулак нашай моцы.
Прыгожае – гэта свабода
ня рыжай лістоце восені,
скарынка чыстага лёду,
старая вінтоўка Мосіна.
Прыгожае – гэта жанчына,
здольная здрадзіць прыгожа
і толькі з тае прычыны,
што доўга цярпець ня можа...
Ня трэба так хваляваცца:
яна пагуляе і вернецца.
Шукай жа, мужчына, працу
для рук тваіх дужых і сэрца.

## БУДЗЕМ

Мудрымі будзем, як зьмеі,
хітрымі, нібы лісы,
чыстымі, як лілеі,
і першымі ў чорных сьпісах.

Добрымі будзем, як маткі,
як сьветлыя сны і мроі,
жанчыны – нібы аплаткі,
мужчыны – як сталь для зброі.

Цёплымі будзем, як дрэва,
і шчодрымі, як на Каляды,
будзем ня справа, ня зьлева,
а там, дзе нам будуць рады.

Будзем, як травы ў росах,
як белыя гіяцынты,
як чэрвеньскія пакосы,
як залежы антрацыту.

Ціхімі будзем, як гольлі
дрэваў хвойнай пароды,
як павуцінка са столі,
як першыя лёгкія роды.

Будзем, браты і сёстры,
супольна крочыць у наступ,
будзем, як меч гостры,
як цяжкі рабочы заступ...

*12.XII.1997.*

## ЗЬ БІЯГРАФІІ

Дрэвы мае вырасьлі хвойныя, зялёныя,
з хаты мяне вынесьлі – ў неба пазіраў
вочы мае плакалі – сьлёзачкі салёныя,
ручкі мяне краталі, каб не паміраў.

Не рабіў вялікага – лаяўся для вечнасьці
словамі на літару маленечкую «бэ»,
я, паэт мясцовай беларускай нацменшасьці
з пашпартам сіненькім рэспублічкі эРБэ.

*26.XII.1997.*

* * *

За гэтыя вусны, што шэпчуць нам па-беларуску,
за гэтыя вочы, што па-беларуску глядзяць,
мы заўтра пакрочым лясною сьцяжынаю вузкай
ад кулі варожай на росных імхах паміраць...
*23.III.1996.*

**НАПЯРЭДАДНІ**

... проста ў вакно маё поўня
сьвеціць, а сын мой названы
дзеліцца думкай наіўнай,
і сам я трывожны ад думак,
і ў небе – о любая! –
ў небе вячэрнім, у чорным,
дзе зорны трытон сушыць брушка
Птушынага Шляху, -
там вечныя і маладыя
мы пралятаем
у нашым цудоўным сусьвеце
і засяваем валокі і дзесяціны
трывалым насеньнем, якое
высьпела ў чэраве
Рыму, Атэнаў
ды Вільні крывіцкай...

* * *

Крочыць альбо нерухоміцца,
прыгожая шпілямі антыкаў,
яа смак, як ажына, модніца
для сьмелай адкрытая практыкі.

Плюральная, нібы камэра
на сто чалавек падсудных,
ідзе жанчына па Вавэлі
пасьля эратычных студый.
*4.III.1998. Кракаў.*

* * *

Робім, як дарослыя,
штучкі эратычныя,
траўкаю парослыя,
контр-а-палітычныя,
росныя, вільготныя,
месцамі крынічныя,
для сваіх – ільготныя,
для чужых – таксічныя.

## AVE, HOMO!

Радуйся, муж, целу!
Вось яно, загарэлае,
перамяшчаецца важна
ааміж асфальтам і небам,
дождж ык яго палівае,
сонейка сушыць і вецер,
рукі ўскідвае цела,
паказваючы падпашкі,
ножкамі кратае цела,
а ў целе, як вінчык у пляшцы,
булькае кроў і лімфа,
і ёкае селязёнка,
цела робіцца піфіяй,
цела сьмяецца звонка,
лаўрамі пахне цела,
кавуном і сьпелым сланэчнікам:
падыдзі да цела з далёкім прыцэлам,
скінь зь цела жаданьняў заплечнікі...
Радуйся целу беламу!
Радуйся загарэламу!
Радуйся целу наструненаму!
Расслабленаму!
Нясьмеламу!
Радуйся целу здароваму:
не прымушай худзець яго,
галіць на ножках валосікі,
а вусны псаваць памадай.
Радуйся целу чыстаму:
цела – як белая гліна,
як шаты дуба вячыстага,
як ліпеньская маліна.

Побач зь целам прыгожым
спакойна і ціха робіцца,
ня будзь жа да цела варожы,
не заклікай горбіцца.
У целе жывуць прагнасьці,
дух і жаданьне свабоды.
Цела – крыніца радасьці
і жыцьцядайных водаў.
Слаўлю я цела: вось яно
перамяшчаецца з гонарам,
рук пара і пара ног,
галава і тулава з органамі.
На целе станік і майтачкі,
дзьве складачкі вэртыкальна,
згуляем зь целам у мячык мы,
а потым пойдзем у спальню.
У спальні саліднай, як цешча,
на ложку салідным, як цесьць,
буду целу чытаць вершы
сама меней разоў шэсьць.

## ЦЕЛА МАЯКОЎСКАГА

Марыя, дай, цела Ўладзімера
ня можа цярпець бясконца.
Расея пад Ленінам прыціхла, як вымерла,
асьлепшы ад бальшавіцкага сонца.

У грамадзянаў у штанах аблокі,
у кішэнях тырчаць чырвоныя кніжачкі,
расстралялі Міколку-цара і лёкаяў,
а страх яшчэ большы смокча пад лыжачкай.

Параплавы Саветаў заходзяць у гавані
краін Антанты зь візітам ветлівым,
у фаворы НЭП, як чаромха ў травені,
але цела сумуе ў касьцюме вэльвэтавым.

Беларус Аляхновіч па памяці крэмзае,
як жыў ён у кіпцюрох ГПУ,
ірванымі ранамі і парэзамі
цела расьпісана, як гросбух.

Цела Ўладзімера ад Каўказу да Мурмана

выпрасталася над трупамі галодных Паволжа.
У Менску чэкісты чысьцяць і ў Мураме,
каб забясьпечыць Маскву збожжам.

Вось цела Маякоўскага, паэта партыі,
і целы беспартыйныя на лягерных нарах.
Рвдкі
        лесьвіцай
                        чаго
                                вартыя,
калі прыступкі вядуць у бестыярый?

Цела хоча пяшчоты, Марыя,
вялікае цела хоча асабліва,
пасьля мяне зьнішчаць беларуса Мрыя,
мільёны пройдуць праз чырвонае мліва.

Ясеніну пісаў я, што памерці проста,
а жыць застацца з кляпам у зубах
паэту немагчыма, і таму так востра
карціць адправіцца ў невядомы шлях.

«Прыйду», – сказала ты, і я паверыў.
Чакаў гадзіну, і дзьве, і тры,
я нават расчыніў камунальныя дзьверы,
як дантыст пацыентам расчыняе ірты.

У газьніцы згаралі і кнот, і вадкасьць,
у лямпе Ўльянава расплавіўся вальфрам.
Суседка за сьцяною пляскала ў ладкі,
і доўга рагатаў дворнік Варлам.

Што ж, Марыя, цела змаглося,
цела больш ня можа цярпець зьдзек.
У гэтым балючым людзкім шматгалосьсі
выпала ЯМУ напароцца на стэк.

* * *

Ты хацеў бы глядзець у гэтыя сінія вочы,
ты кацеў бы ў плячо гата белае пацалаваць,
але дзень над Краінай зьмяніўся бясконцаю ноччу,
і адно ёсьць жаданьне – за Волю ісьці ваяваць!

## НЯ ХОЧАЦЦА

Ня хочацца быць нікім,
ня хочацца быць бедным,
чытаць правінцыйны «ЛІМ»,
праходзіць па справе падсьледным.

Ня хочацца быць без вады,
бяз мыла, запалак, солі,
бяз мовы, кавалка яды,
здаровай жанчыны і волі.

*19.VIII.1998. Альхоўка.*

* * *

... хворая паясьніца маткі,
бацькавы нараканьні,
братава адасобленасьць,
ягоныя жонка й дачушка;
сястра крыклівая з сынам
і быцькам твайго пляменьніка;
хросная маці Часлава
з гораду Белапольле;
у хляве цялушка здаровая
ўжо на дзявятым месяцы;
дрэвы, якім так файна
расьці на вольніцы хутара;
старая бацькава хата,
прапахлая пацукамі,
і матчыма хата, прапахлая
табакай і дымам зь печы;
таварыш, якому учора
ты вызваліў месца ў камэры,
і вораг, які варты
тваёй мельхіёравай кулі
альбо хоць бы твайго слова,
што, нібы снарад гаўбічны,
ўзарэ дзесяціну варожую,
на якой мы заўтра пасадзім
Дрэва Нашай Свабоды!

*23.IX.1998. Менск, гатэль «Юбілейны».*

## НЕАДОЛЬНАЕ ЖАДАНЬНЕ БЫЦЬ МУЖАМ

Здаецца, я – гэта муж твой,
той самы ў тваіх абдымках,
іду з работы напружаны,
нібы зладзюжкі на рынках,
іду на водар парфумы,
на формы юнай гетэры...
Жанчына – мае Фіумы,
законы і прынцып веры.
Брутальны кантэкст рэжыму
прасую эратафільна,
разбаўлены градусам джыну,
латэнтны і супэрмабільны,
гатовы да рэвалюцый,
нібы прапаганда кайзэра,
вільготны ад сьлёз і палюцый,
чытаю ў камэры Драйзэра,
заходжу ў кватэру.дзе водар
кухні, дзяцей і спальні,
і ты пасьля пятых родаў
цалуеш так натуральна.

* * *

... Пасьля ванны пахнеш добрым мылам,
пасьля працы – пломбамі і ёдам,
пахнеш кухняй, хлебам, хатнім мылам,
пахнеш рыбай, жніўеньскім гародам,
пасьля мужа пахнеш дзьмухаўцамі,
пасьля фэсту ў Будславе – касьцёлам,
пахнеш кменам, аерам, квасцамі,
велікодкай булкаю і толам,
пахнеш васемнаццацьцю гадамі,
пахнеш так, як пахну я, калі
пакрываю прасьціну сьлядамі
нібы разараны пласт ральлі.

*1998, кастрычнік.*

## ДУМАЮЧЫ ПРА ГОРШАЕ

Жанчынаю станеш ты безь мяне,
бяз бацькі народзіш сына,

а я загіну на жорсткаЙ вайне
і хутка ў крыві астыну.

Мяне падбярэ санітарны ўзвод:
да цела прывяжуць рукі
і белай фланэлькай нрыкрыюць рот
пад вусьцішны сьвіст базукі.

Заціхне на брустվэры наш камісар,
сяржанту прастрэляць грудзі,
і кроў зашыпіць, як зьмяіны цар,
сьцякаючы ў глебу Жмудзі.

* * *

Калі выплывае поўня,
мне сьняцца дзіўныя сны:
тваё гарачае ўлоньне
на барыкадах вясны.

## АПТЫМІСТЫЧНЫЯ РАДКІ Ў ЧАС АДВЭНТУ

Над нашай Вільняй зорнае неба,
у «Нашай Ніве» зварылі каву,
таварыш пайшоў па хлеб і да хлеба,
а ў мяне якісьці настрой кучаравы.

Пані Юзя на кухні шынкуе капусту,
я адкаркоўваю піва «Жывец»
і намазваю масла на хлеба лусту,
нібы жоўты пясочак на ўласны капец.

*6.XII.1998. Варшава.*

* * *

Мароз. Нікога не люблю
(часова).
Паўзе нізамі курс валют,
як гук басовы.

Купляю ў краме капялюш
вялікі, чорны,

каб захінаў мяне ад сьцюж
сырых, надворных.

Заходжу ў паб, дзе піва дух,
і п’ю там каву,
раве з дымаміка рок-зух –
радыё «Wawa».

*13.XII.1998. Варшава.*

## ДЗЕЛЯ НАШАЙ ЛЮБОВІ, АЛЬБО НОВЫЯ ЛЁЗУНГІ

*Героям падпольля прысьвячаю*

Мы пойдзем рабіць гэта сёньня. І вясна дапаможа нам. Вясна ўліе ў нашыя целы магутную энэргію каханьня, любові й страсьці. Кожны з нас ускладзе на рамёны сваю ўласную ношку. Мы будзем прамаўляць у тахт крокам радкі любімых вершаў.

З мужчынамі побач будуць жанчыны, маладым людзям дапамогуць дзяўчаты. Хтосьці возьме з сабою букецік першацьветаў, хтосьці – стартавы пісталет, перароблены пад дробнакалібэрныя набойчыкі, а хтосьці, невысокі й каржакаваты, ускіне на сьпіну заплечнік з трынітраталуолам.

Пасьля зацяжных халадоў настане цяпло, кнігаўкі апануюць поплаў, яшчэ весялей пабяжыць па дрэвах сок, зацьвіце сон-трава, над бліндажамі апорных базаў зацёхкае салавей.

Нашая паэма, на жаль, будзе доўгай. Але мы мусім яе дапісаць – дзеля нашай лгобові да Бацькаўшчыны, да нашых прыгожых жанчын.

Мы пойдзем рабіць гэта сёньня. Сьмела й стрымана, ціха ступаючы і зь вераю ў сэрцы. Мы выгукнем новы лёзунг – «Patria o muerte!» А інакш немагчыма, інакш нам будзе дрэнна. І таму мы пачнем рабіць гэта сеньня. Абавязкова.

Наш рух па тэрыторыі, якая завецца Беларусь, пачаўся й працягваецца пад акупацыяй. Усё, што мы робім – робім акцыяй супраціву. Мы будзем супраціўляцца дзеля вашых жанчын, бо яны жадаюць пайсьці за намі, але толькі эа намі мужнымі.

Бацькаўшчына ёсьць нашай Вялікай Жанчынай, у ейным улоньні мы паўсталі, у ейных межах хочам знайсьці апошняе

супакаеньне. Бацькаўшчына, Матка ўсяго беларускага, адзіны й непаўторны кантэкст беларускага духу. Вось за ШТО мы пішам на цэры ворага знакі беларускага супраціву.

# «У чорным пасьля дажджу»
## *Вершы розных гадоў*

### У ЧОРНЫМ ПАСЬЛЯ ДАЖДЖУ

Я іду пад чорным парасонам,
чорны гальштук, чорны гарнітур.
Чую за сьпіной гудкі клаксонаў
і машын напорысты алюр.

Пад нагамі сьцелецца бетонка,
веснавое сонца нада мной,
праваруч мяне сьмяецца звонка
дзеўчынёшка а чорнаю касой.

Высыхаюць хутка тратуары
і бралі высотных камяніц,
і гарыць прываблівасьць на тварах
у сустрэчных дзёрзкіх маладзіц.

Разьмяняць рубель на карамелькі
па-суседзку ў краме я прашу
крамшчыцу віхрастую. З бутэлькі
піва п'ю, а потым – саграшу.

Потым зноўку спорны дождж праьецца,
потым я напару з маладой
дзеўчынёхай, што заўжды сьмяецца,
можа быць, што весела са мной.

### ДА ПЫТАНЬНЯ ПРА ТОЕ, ЯК ПІШУЦЦА ВЕРШЫ

Фатэль. Раскоша адзіноты.
Любімай кнігі пераплёт
цябе прагненьнем да работы
пратне зьнянацку навылёт.

Ты аркуш чысты асьцярожна
перад сабою пакладзеш,
адчуўшы, як душа трывожна
пайшла пісаць свой белы верш.

Імпэту хопіць на хвіліну,

а потым зноў фатэль. Адзін
ты будзеш корчыцца ад спліну
і клясьці хуткі лёт гадзін.

Ды, наталіўшы смагу кавай,
засьнеш апоўначы, дальбог,
прызнаньнем трызьнячы і славай,
згарнуўшы коўдру каля ног.

## КНІГА

За рубель і пяць капеек
я купіў у краме кнігу.
Пахла кніга фарбай, клеем
і вясной, як тая крыга.

Прыплыла з паліцы ў краме
крыга-кніжка мне ў далоні.
На старонцы ў белай раме
дум людзкіх пульсуюць скроні.

Я гартаю кнігу-тайну
пасьля практыкі мазольнай
і між словаў разнастайных
я знаходжу слова Вольнасьць.

* * *

Гляджу, як сытая бездапаможна,
кладзецца спаць людзкая грамада,
цалкам уся і паасобку кожны
пад гукі клазэтныя, дзе капае вада.

Заўтра ранак мухаморава-росны
будзе адсьвечваць на сьценах і дратах.
Прачнецца чалавечак зь мінай поснай,
блытаючыся ножкамі ва ўласных штанах.

Закруціцца векшай у клопаце абрыдлым,
і давай прытопваць пад розныя дудкі,
слухаючы блеф кабінетнай дылды,
дзелячы жыцьцё на шэрыя суткі.

А ранак разьліецца ў дзень галубіны,
у шэпт лістоў і мурашыны бег,
у слодыч ранетную і пыл руінаў,
верабём шыбаючы з-пад родных стрэх.

## ГОСЬЦЯ

Да мяне заходзіць краля
з кампліментамі і без,
пахітоску пекна паліць
і танцуе паланэз.

Мы зь ёй двое пляжым віны
і вячэру на сямёх,
і нікога без даніны
не пушчаем на парог.

Мне знаёмы яе зубы,
яе вусны, яе стан.
Давядзе мяне да згубы
белай кралі халістан.

Я пяю для кралі гімны,
я ёй лускаю гарэх,
я зь ёй ціхі і нястрымны,
я зьдзяйсьняю зь ёю грэх.

Русы волас белай кралі
пстрыкне шпількай залатой,
і рассыплюцца каралі
пад настырнаю рукой.

Пояс чорны з дэрматыну
аб’ядднае дзьве душы,
і па моры эратыну
паплывем, як па шашы.

* * *

Я пяю. Гавяду маіх вершаў
пасьвяць пастухі літаратуры,
сонца ім пячэ старыя плешы
рабацінне сеючы па скуры.

Я іду. Імчаць па аўтабане
мудрыя машыны без шафёраў,
а тубыльцы па сваім экране
сочаць за работай сьветлафораў.

Я маўчу. Гумовая пакрышка
расьцьвітае кветкамі агрэсту
з дрэва ўпала мне на голаў шышка
утварыўшы акцыю пратэсту.

Я пішу. Працэс пісаньня словаў
не падобны на чытаньне іх жа;
Гэта, скажам, як бы сотні лёваў,
альбо пецяў, скажам, альбо грышаў
сталі есьці разам памідоры.
Зрэшты, я ня ведаю, навошта,
а вядома мне, што носіць пошта
прэсу, дзе ня пішуць пра мяне.

* * *

Цішыня – апазыцыя гукам
і маўчаньне ў адказ на словы –
дазваляе музыкай Глюка
заслухоўвацца адмыслова.

Цішыня напаўняе хаты
ў час народзін, парой зыходу.
Цішыня – гэтаксама краты,
за якімі прагнудь Свабоды.

Вадаспады пачуцьцяў сьмелых
і крыніцы болю й жаданьня
адбіваюць у водах белых
чысты вобраз майго каханьня.

Увайдзі ж у скляпеньні духу,
цішыня, апануй жаданьні,
утаймуй мае жаль і скруху,
пераняўшы іх на зьмярканьні.

* * *

Я не герой, я проста адзінокі,
зацяты ў рукаблудзтве пісарчук,
душы сваёй перапаўняю докі
сталёвымі кантэйнэрамі мук.

І слабы я, каб быць героем часу,
і думаю брутальна пра жанчын,
і не люблю зусім людзкую масу,
тым больш не пераварваю мужчын.

Брутальны я, і з плямбаю героя
ня мне хадзіць, задзёршы ўгору нос,
збыткоўная ўва мне гнязьдзіцца мроя,
усё часьцей начамі сьніцца зброя,
і хочанца пакінуць межы рою,
ці, як жуку, схавацца за карою,
альбо ўкалоцца і пайсьці ў разнос,
альбо зрабіць зь нявыплаканых сьлёз
учынак, што й дыктуе мне мой лёс.

## БОГ

Да мяне зноў вяртаецца Бог,
Бог расы, камянёў і глебы.
Ён сябе для мяне зьбярог,
як зямлю зьберагае неба.

Ён па кроплі чырвоным віном
у маеналіваецца жылы,
ахінае шчасьлівым сном
і дае для палёту крылы.

Ды калі я часамі так
зануджуся, што сэрца рве мне,
ён прыходзіць і кажа: слабак,
стань мацней за агонь і крэмень!

І яму запярэчыць я
не знаходжу важкай прычыны.
Бог цікуе за мной здаля,
і найменьне яму – Жанчына.

* * *

Мая Жанчына
ўсьміхаецца мне,
катуючы маё сэрца,
а сьлёзы й просьбы мае
яе злуюць,
а вачыма яна пасьміхаецца,
а рукамі гэткімі зграбнымі,
смуглявымі, далікатнымі й гатовымі
да пацалункаў – рукамі гэтымі
яна заціскае мой прагны да крыку рот.
Мая Жанчына – сымболь і паходня,
І дух, разьліты скрозь у сьвятле і ў цемры,
які вядзе мяне па жыцьці.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Паспрабуй
адабраць
у мяне
Жанчыну.

**ДАЧКА**

Дзесьці ходзяць твае ножачкі,
аб асфальт абцасік стукае,
на травы зялёнай ножычкі
ты іртом маленькім хукаеш.

У касе тваёй істужачка –
белы колер і чырвоненькі,
і сама ты быццам ружачка,
а ў руцэ тваёй балёнікі.

І бяжыш ты за прысадамі,
каля дзедаўскага хутара,
між Вялікднем і Калядамі,
як па сэрцы маім сутарга.

**ЖАНЧЫНА І ПАЧАТАК ДНЯ**

Новы год сустрэў зусім аднабока,
трэцяга студзеня езьдзіў у сваты
да самотнай родам з-пад Налібокаў,

а сёньня ўпарта сьніліся краты.

Устаў ня тое, каб вельмі позна,
хоць і стаміла начная зьмена.
Выходзіў з пахмельля мэдыкамэнтозна,
гатуючы каву, апёк калена.

На дварэ, што праўда, было не найлепей:
халодны вецер злаваў прахожых.
І тут праз фіранку імжы-халепы
я ўбачыў формы жанчыны прыгожай.

Уся яна была ў маім стылі:
фігура поўная, ножкі таксама.
Рукі жаночыя раму мылі,
твар хаваўся пад валасамі.

То ножку ставіла на падваконьне,
а то і дзьве, напінаючы грудзі.
Уперад імкнулася, як Пагоня,
з галавою, убранай у бі-гудзі.

Я мусіў бегчы па нейкіх справах,
але забыўся, куды й навошта:
ді то на мітынг да быццам правых,
ці то на левы пікет ля пошты.

Дзень паўставаў. Падсыпала сьнегу.
Хмары гарусьціліся на хмары.
Я сеў за стол, разгярнуў Артэгу,
і ўспомніў свае дзіцячыя мары.

*24.I.1999.*

## АЎТАБІЯГРАФІЯ “СЦЭНАР ТРЫЦЦАЦІ СЯМІ”

Станцыя Унежма Анежскага раёну Архангельскай вобласьці, 1962 год, 8 сакавіка – я нарадзіўся. Сярэдзіна 60-х – бацькі прывозяць мяне ў Беларусь (хутар Казіміраўка Мядзельскага раёну Менскай вобласьці).

Канец 60-х – першыя проблiскі сьвядомасьці: стаю за будынкам з самаробнаю лялькай у руках; разам з маткаю ўцякаю па чорнай ральлі ад бацькавых пабояў, пажар, навальніца і дождж.

1969 год – пайшоў у першы клас Камароўскай пачатковвай школы. Першая настаўніца – Эліна Казіміраўна.

1973/74 навучадьны год – зімую ў Будслаўскім прышкольным інтэрнаце для дзяцей з аддаленых вёсак. Першая грамадзкая «прапіска» ад старэйшых школьнікаў казённай падушкай па галаве.

1974 год, вясна – пайшоў у прыбіральню з падручнікам па расейскай мове для 4-5-х класаў, пазычаным у на год старэйшага Юзіка Сяліцкага з Альхоўкі. Задумаўся, упусціў і – ах, трагедыя! – страшэнна расплакаўся, абсеўшы каля інтэрнацкага штыкетніку. Божа, па чым жа я плакаў!?

1974-ы, люты. Сонечны дзень, адліга, мокры местачковы брук. Хаваем Паўліну Мядзёлку.

1975-1977 гады – перапіска з Саліхой і Нэфісой Хусэінавымі з Баўгарыі, якая перапыняецца пасьля эміграцыі сёстраў у Турцыю.

1977-ы. Мне 15. У кнігарні мястэчка Будслаў набываю аднатомнік твораў Цёткі ў афармленьні мастака Міколы Купавы з прадмоваю Сьцяпана Александровіча. У кутку зьнізу ўверх надпісваю: «Адамович С. 16.III.77 г.». Пазьней, гадоў празь дзесяць, расейскае «и» было мною закрэсьлена.

1977-1979 гады – вучоба ў Сьвірскім СПТВ-17. Непрыемны, дрэнны пэрыяд жыцьця. Але давучыўся, атрымаў спэцыяльнасьці трактарыста-машыніста, электраманцёра і апэратара машыннага даеньня (дояра).

Назва нямецкага даільнага апарату D-2 «Майга» памятаецца асабліва.

У гэты ж самы час завёў дзёньнік, але па невялікім часе зьнішчыў яго. Да пары да часу рэфлекс пісьменьніка сьцюцюрыўся і заціх.

1979 год, жнівень-верасень. Работа на цаліне (Какчатаўская вобласьць, Куйбышаўскі раён, рака Ішым). Зарабіў 500 рублёў. Вярнуўшыся з заробкаў, атрымаў правы трактарыста і набыў у мястэчку Крывічы матацыкл «Мінск» чырвонага колеру – за 400 рублёў.

1979-1980 гады. Ад восені да восені працую сьлесарам на мэхдвары саўгаса «Будслаўскі». Часта філоню за паравозным катлом у кацельні, вучуся піць чарніла у кампаніі каваля, токара і зваршчыка, прывыкаю да цыгарэт (асабліва падабаецца баўгарскі «Апал»).

1980 год, кастрычнік, позва ў ваенкамат. Забіраюць у савецкую армію. Пра падзеі ў Аўганістане нічога ня ведаю. Трапляю ў «вучэбку» г. Піянерска Калінінградзкай вобласьці. Празь пяць месяцаў шкаленьня атрымліваю пасьведчаньне авіяцыйнага мэханіка палубных гелікоптэраў «КА-25»-х. З вучэбнага падразьдзяленьня трапляю на базу забесьпячэньня Чарнаморскага флоту, што пад Сімферопалем. Крым, марская форма і ўсяго два гады службы. Упершыню мне пашанцавала.

1982 год, лета. Я «дзед»: бесказырка на патыліцы, чорнасуконныя штаны-клёш. Па суботах і нядзелях ладзім танцулькі.

Прыходзяць дзяўчаты: зь сельгастэхнікуму, школьніцы. Вясёнчата-вяснушкавая, чорнавалосая і далікатная выпускніца дзясятага класу Галіна Юрчак на чатыры месяцы выбірае мяне.

1982-гі, восень. Вольны ад службы час баўлю з удавіцай. Аднойчы спазьняюся на вячэрнюю праверку. Старшына роты дае трое сутак гаўптвахты. Начальнік гарнізоннай вязьніцы дабаўляе. Першае знаёмства з камэрай. Славяне мужна адбываюць свае тэрміны. Армяне адзін за адным рэжуць лёзам далоні, абы не сядзець. Ім робяць перавязку ды йзноў садзяць.

З «губы» выйшаў праз месяц, з трыццаці дзён пятнаццаць адбыўшы ў адзіночцы. А ўжо пятага сьнежня 1982 году на чыгуначным вакзале Менску я дыхаў марозным паветрам Радзімы. Скончыўся пэрыяд застою.

1983 год. Усю зіму прападаў зь Ленкай Залатухай – адводзіў душу пасьля войска. Вясною пайшоў працаваць на чыгунку – манцёрам Маладэчанскай дыстанцыі. Хапіла мяле на пяць месяцаў. Кінуў і Ленку, і чыгунку ды рынуў у Менск пастулаць у інстытут культуры. Месяц часу жыў у якойсьці адзінокай жыдоўкі. Рыхтаваўся да ўступных. Ня здаў. Вярнуўся ў вёску і трапіў у гісторыю, якая каштавала мне двох гадоў умоўна і 25-ці % штосяц на працягу году.

1983-ці, восень. Ізноў Менск. Уладкоўваюся вучнем фрэзэроўшчыка на станкабудаўнічы завод, але фактычна працую сьвідравальшчыкам. Каб зарабіць 220 рублёў «чыстымі», трэба штозьмену апрацоўваць 8 станін. Калі-нікалі ўдаецца. Чыгунны пыл і керасінавая пара штодня асядаюць на лёгкія. Канец ліпеня. Адразу пасьля экскурсіі ў Маскву, дзе я быў першы і адзіны раз, трапляю ў інстытут сухотаў, што пад Менскам. У лёгкіх знаходзяць малавядомую дактарам хваробу – Саркаідоз Бека. Робяць пункцыю правай долі. Пяць месяцаў у стацыянары. Выхаджваюць гармана-нальнымі прэпаратамі, найперш прэднізалонам. Хвароба настройвае на лірычны лад. Дзёньнік, які йзноў пачаў весьці ў канцы 83-га, цяпер запаўняю па-беларуску. Вечарамі чытаю беларускае.

1985-ы. Пралячыўся. Выпісалі. Выйшаў на работу - стаў за станок. Заходжу ў «Чырвоную змену». На старонках гэтага выданьня зьяўляюцца мае першыя празаічныя зацемкі і кароткія вершы. Друкуюся таксама ў заводзкай шматтыражцы «Кіравец», сьпяваю ў самадзейным вакальна-інструмэнтальным ансамблі. Наш мастацкі кіраўнік, жанчына гадоў 60-ці, спрабуе паставіць мне голас. Але мяне больш цікавяць формы нашай маладой культработніцы.

1985-ы, сьнежань. Дом творчасьці «Каралішчавічы». Першае знаёмства зь пісьменьніцкім асяродзьдзем: Р.Барадулін, В.Зуёнак, І.Чыгрынаў, Л.Баршчэўскі ды іншыя. Цікава, нязвычна, сьвежа. Старэйшыя вылічваюць стукача. Баршчэўскі голасна расказвае палітычныя анэкдоты – правакуе. Барадулін на мой радок «я дома, пасярод жытоў» адгукаецца радком «Я дома, пасярод жыдоў». У

апошні дзень сэмінару зьяўляецца А.Сыс: з барадой, яшчэ малады і важны, ён называе сябе княжычам.

Год 1986-ы. Звольнены з працы на заводзе. Летам займаюся на дзённых падрыхтоўчых курсах – рыхтуюся да паступленьня на філфак БДУ. Прыходжу ў грамадзка-культурнае таварыства «Талака». У гэты ж самы час – ліпень-жнівекь – савецкія спэцслужбы спрабуюць завербаваць, абяцаюць падтрымку ў вучобе.

Верасень. Залічаны на першы курс дзённага беларуска-расейскага аддзяленьня філялягічнага факультэту.

Лістапад. Бяру шлюб з Вольгай, дачкою армейскага маёра родам адкульсьці з Уралу. Жанімства паклікала у прымакі. Іду.

1988 год, красавік. Развод. Вольны. Зь першакурсьнікамі раблю насьценгазэту «Слова філолага», што зьяўляецца прадметам пастаянкых разборак у дэканаце.

1989 год. З групай барысаўскіх школьнікаў іду ў тыднёвую вандроўку па Літве і Беларусі. У Вільні на месца страты Кастуся Каліноўскага пры разгорнутых нацыянальных сьцягах ускладаем кветкі.

1990 год. У жніўні выходзіць першы зборнік вершаў «Кальва-рыйскія клёны» – адзіная кніжка, выдадзеная ў дзяржаўным выдавецтве, за якую я атрымаў ганарар.

У выніку непаразуменьняў з выкладчыкам расейскай літаратуры, расейцам паводле нацыянальнасьці й духу, мяне адлічваюць зь філфаку БДУ. Да лета 1991 году жыву ў студэнцкім інтэрнаце №7 г. Менску. Займаюся самаадукацыяй, для вершаў спрыяльны час – пішу.

1991 год, красавік. З дапамогаю энаёмага ўладкоўваюся на пасаду стыль-рэдактара «Настаўніцкай газэты». Выходзіць прэзэнтацыйная падборка вершаў. Тэксты набраныя паводле граматыкі Браніслава Тарашкевіча. Гэта не падабаецца аднаму з супрацоўнікаў рэдакцыі, але ў канфлікце этнасаў перамагае мой бок. Празь некалькі гадоў мой апанэнт эмігруе ў ЗША.

Чэрвень. З дапамогаю рэдактара «Настаўніцкай газэты» і Міністэрства адукацыі атрымліваю для жыцьця пакой у інтэрнаце, які належыць гарадзкому прафтэхвучылішчу №24.

Жнівень-верасень. На месца дэкана філфаку БДУ прыходзіць новы чалавек. Я рэабілітаваны ў правах студэнта 5-га курсу. Узьнікае новая сытуацыя: вучуся на дзённым аддзяленьні і адначасова працую ў рэдакцыі.

1992 год. Чэрвень. Абарона дыплёмнай работы на тэму «Паэзія беларускай эміграцыі». У графе «Беларуская мова» – сіськатая лічба «3». Нездарма казалі мне: вучыся так, каб была морда чырвонай, а дыплём сіні, і не наадварот. І ўсё ж дзесьці зусім блізка ў страваваьным тракце пачала падсмоктваць зьнішчальная прага рэваншу.

1993 год. Выходзіць другая кніжка вершаў.

Ліпень. 22 дні адлачынку на ўзьбярэжжы Чорнага мора. Сустракаю беларуску родам зь Семежава. Ідзе са мною, разумее і кахае.

1994 год. Фармулюю ідэю «Правага Рэваншу»: за незалежнасьць Беларусі – Духам і Зброяй. Дзясяткі маладых людзей напісалі заявы на ўступленьне ў «PR». Пад штандарам «Правага Рэваншу» праводзім некалькі акцыяў, што вымушае камітэт дзяржбясьпекі зрабіць адпаведную заяву.

Восень. Выходзіць трэцяя кніжка вершаў – «Зваротныя правакацыі».

Лістапад. Віцебск. У мастацкай галерэі Алеся Пушкіна праводжу Першы Зьезд Беларускіх Нацыяналістаў. Міліцыя перашкаджае. Арганізатараў затрымліваюць. Трое сутак арышту.

1995 год. Травень. Звольнены з «Настаўніцкай газэты» з фармулёўкаю «па скарачэньні штатаў». Пайшоў на біржу працы. Шэсьць месяцаў атрымліваю грашовую даламогу. Летам – першая публікацыя ў «Нашай Ніве».

Восень. Пішу тры вершы па-расейску: «Убей президента», «Письмо судебному исполнителю» і «Если мне, не приведи Господь...»

Здымаюць з уліку на біржы працы. Застаюся бяз сродкаў для існаваньня. Іду і прадаю з рук недзяржаўную прэсу: у пераходзе каля Акадэміі Навук Беларусі, у пераходзе на Круглай, у электрычках. Міліцыя затрымлівае, суды штрафуюць, судовыя выканаўцы стукаюць у дзьверы.

1996 год. Па факце публікацыі верша «Убей президента» пракуратура ўзбуджае крымінальную справу №182. 4 красавіка – арышт. Зьмяшчаюць у сьледчы ізалятар КГБ РБ – «амэрыканку». У жніўні – этап у сьледчую турму г. Віцебска – відебскі цэнтрал.

16 сьнежкя – пачатак судовага працэсу.

1997 год, студзеяь. Працяг судзілішча.

7 лютага вызваляюць пад падпіску пра нявыезд.

13 чэрненя – фармальнае заканчэньне працэсу.

Жнівень. На адным зь мітынгаў ажыцьцяўляю акт супраціву – зашываю рот.

1998 год. Занадта часта адчуваю сябе самотным, занадта часта любоў саступае нянавісьці і хочацца пайсьці ўзарваць аўтамабіль.

1999-ы. Жыву. Мой адрас: 220013, Менск, вуліца Сурганава, дом 45, корпус 3, інтэрнат, паверх 8, блок 5, кнопка званка – справа.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

# ЗМЕСТ

**З кнігі «Кальварыйскія клёны»**
*1990*


Доля
Ядлоўцаваму кусту
*** Глянцавіты зялёны брусьнічнік…
*** Тамсама ўсё квітнее…
Размова зь яшчаркай на прыдарожнай крушні
*** Калі сьціскае грудзі...
*** На ворыва маё штовесну...
*** Я не прыйшоў...
*** Кальварыйскія клёны асеньнія…
Заўтра
Батанічная восень
Верасень
*** Павісла пража маткі боскай…
*** Наперадзе бязьлюднай электрычкі...
*** Кармінавая цішыня…
*** Не сьпяшай, мая рыжая векша...
*** Перуны адгрымелі...
*** Вы чыталі Міцкевіча...
*** Як закаханы ўпершыню хлапчук...
Гульліва
Прызнаньне
*** Чэрствым акрайцам у кіпені пачуцьцяў...
*** Калі запросяць мяне ў краіну…


**З кнігі «Зямля Ханаан»**
*1993*


*** У рыдване каціцца прывідам…
*** Маіх вачэй расчыненыя форткі…
*** На ўзроўні маланкі і грому...
*** Як я люблю, зямля…
Зямля Ханаан
Хларафілавы бунт
Шорахі
Экспрэсія, альбо Аднойчы, прыслухаўшыся да свайго голасу
Файна
Паводле Фрэйда
*** Мой бог даўно мяне пакінуў...
Верш для Юліі
*** Разгубіліся вусны мае...
*** Я вечна адзін. Прыходзьце...
*** Сонца...
*** Ну чаму вы так позна...
*** Сайку белага хлеба...
*** Ах, як прыгожа твае рукі...
Жанчыне, што пакідае мяне
Размова зь сябрам
*** Зноў чарговая восень...
Вітамінныя хлопчыкі
Сябрам «Талакі» 1985 году
У кавярні
*** Стамілася, ледзьве што дыхае цела…

*** Я ніколі ня лашчыў радкі свае…

**З кнігі «Зваротныя правакацыі»**
*1994*

Мы
*** Тутэйшыя мальвы і ластаўкі…
Альтруістычнае
Сон пра нож
*** Блукаю і блудадзею…
*** Пекнасьць простае рэчы…
Момант перамены рытму
*** Калі жанчына спажывае грушу…
*** Зіма. Разгуляўся люты…
*** Трапіўшы ў белую гурбу грудзей…
*** Зіма – ні марозу, ні гурбаў…
Тацьцяне
Ранішнія кантамінацыі зь пераўвасабленьнем на фоне сонца і дажджу
Марфалягічная дэструкцыя галавы ў сакавіку
Гарызантальнае перамяшчэньне сківіц
Мімалётны эксцэс зь Евай Браўн
На дзень стварэньня арганізацыі «Правы Рэванш»

**З кнігі «Каханьне пад акупацыяй»**
*1996*

Калі яна пакідае арган
*** Я чуў, каханая, што ты будуеш дом…
Траекторыя нэрвовага ціку
*** Зьнікла энэргія слова і цела…
*** Не магу, не хачу адмовіць…
Крызастомія
Сэнтымэнтальная сустрэча на лініі агню
Ода жаночым вусікам: як эратычнаму сымбалю, як знаку жаночай мужнасьці, як прычыне мужчынскага неспакою
*** Зайшла. Расказала пра мужа…
*** Калі ты здрадзіш мне аднойчы…
*** Ты ведаеш, а сьвет яшчэ пякнейшы…
*** Ты плывеш са мною побач…
Літанія, альбо Запрашэньне Дзевы на Беларускі Пасад
Антрапаморфныя трянсплантацыі з Граалем напярэдадні Жаночага цыклю
Алжыр
*** Каляды. Посная Куцьця…
*** Я паганы, мне добра з поганьню…
Вячэрнія мроі а элементамі паганства

**З кнігі «Сьпіраль Бруна»**
*1998*

*** «Рукі назад!..»
*** Ах, проста блакітнае неба…
Педэль
Сустрэча з афіцэрам Смаргонскага пагранатраду
Чыстае
*** Кавалак чорнага хлеба…
*** Жыць хочацца, бадай што, як ніколі…
*** Такая ціхая і сьціплая…

*** Не гані пургу, начальнік…
*** Няма куды бегчы, таварыш…
Малодшаму сяржанту Віталю, сядзельцу 4-й камэры СІЗО КГБ
*** Канчаецца лета. Яблычны спас…
*** Ізноў кастрычнік. Час пасадкі дрэва…
У судзе
Ён
*** Студзень. Спачатку марозны…

**«Дрэва нашай свабоды»**
*1997-1998*

*** Ад пераможных нашых радкоў…
*** Рабі ГЭТА са мною…
*** Каханьне бяз рэтушы, голае, галоднае…
*** Чагосьці не хапае перманентна…
*** Сярод аўтакефаліі бароў…
Яна
Калі ты вернесься Героем
Прыгожае
Будзем
Зь біяграфіі
*** За гэтыя вусны, што шэпчуць нам па-беларуску…
Напярэдадні
*** Крочыць альбо нерухоміцца…
*** Робім, як дарослыя…
Ave, homo!
Цела Маякоўскага
*** Ты хацеў бы глядзець у гэтыя сінія вочы…
Ня хочацца
*** … хворая паясьніца маткі…
Неадольнае жаданьне быць мужам
*** Пасьля ванны пахнеш добрым мылам…
Думаючы пра горшае
*** Калі выплывае поўня…
Аптымістычныя радкі ў час Адвэнту
*** Мароз. Нікога не люблю…
Дзеля нашай любові, альбо Новыя лёзунгі

**«У чорным пасьля дажджу»**
*Вершы розных гадоў*

У чорным пасьля дажджу
Да пытаньня пра тое як пішуцца вершы
Кніга
*** Гляджу, як сытая бездапаможна…
Госьця
*** Я пяю. Гавяду маіх вершаў…
*** Цішыня – апазьщыя гукам…
*** Я не герой, я проста адзінокі…
Бог
*** Мая Жанчына ўсьміхаецца мне…
Дачка
Жанчына і пачатак дня
Сцэнар трыццаці сямі